Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

21 ЧЭРВЕНЯ 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 115 (28982)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

+TV ПРАГРАМА

СПАРТЫЎНАЙ УДАЧЫ І ГУЧНЫХ ПЕРАМОГ!

Членам дэлегацыі Рэспублікі Беларусь на II Еўрапейскіх гульнях 2019 года ў г. Мінску

Дарагія сябры!

Гісторыя алімпійскага руху ў нашай краіне даўняя і слаўная. Мы ганарымся беларускімі атлетамі, чые імёны і трыумфы назаўсёды ўпісаны ў пераможны летапіс айчыннага і сусветнага спорту. Захапляемся іх мужнасцю, сілай духу і воляй да перамогі.

Быць дастойнымі пераемнікамі куміраў папярэдніх пакаленняў — значыць паказаць на II Еўрапейскіх гульнях максімум сваіх магчымасцяў і найлепшы вынік. Яркімі выступленнямі і неаспрэчнымі рэкордамі чарговы раз узняць краіну на п'едэстал спорту высокіх дасягненняў.

Перакананы, што нацэленасць на поспех, майстэрства, прафесійныя амбіцыі трэнераў і спартсменаў прывядуць нашу каманду да новых алімпійскіх вяршыняў. Энергія роднай зямлі прыдасць на гэтым шляху сілы, а падтрымка балельшчыкаў настроіць на бескампрамісную і захапляльную барацьбу за медалі.

Веру ў вас, жадаю моцнага здароўя, спартыўнай удачы і гучных перамог на славу нашай Беларусі!

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь,
Прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта
Рэспублікі Беларусь
Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Яркі год — яркі ты!

Сёння ў Мінску адкрываюцца II Еўрапейскія гульні

Фота БелТА.

Пляцоўка адпачынку з настроем

У Мінску каля Палаца спорту ўжо адкрылася галоўная фан-зона, сёння такія пляцоўкі з'явяцца каля «Мінск-Арэны» і «Чыжоўка-Арэны»

Сталічныя фан-зоны гатовыя прымаць гасцей штодня з 10.00 да поўначы, а ў дні адкрыцця і закрыцця Гульняў фан-зона каля Палаца спорту будзе працаваць да 4 раніцы.

Адкрыццё галоўнай зоны актыўнасці балельшчыкаў Еўрапейскіх гульняў ператварылася ў маштабнае шоу: на вялікай сцэне каля сталічнага Палаца спорту выступілі Прэзідэнцкі аркестр Беларусі пад кіраўніцтвам Віктара Бабарыкіна і зоркі беларускай эстрады. *«Мы два гады ішлі да таго, каб сказаць, што Мінск гатовы да правядзення II Еўрапейскіх гульняў, прыёму ўдзельнікаў, а таксама да таго, каб падарыць чарговае свята,* — адзначыў на адкрыцці галоўнай фан-зоны **намеснік старшыні Мінгарвыканкама Арцём ЦУРАН.** — *Мы хочам не толькі паказаць нашу абноўленую сталіцу, але і пазнаёміць замежных гасцей з лагоднасцю, ветлівасцю і гасціннасцю мінчан».*

Побач са сцэнай размясціліся дзясяткі міні-зон з рознымі гульнямі. Хтосьці «рубіўся» ў петанк, нехта гуляў у міні-футбол з акулярамі віртуальнай рэальнасці або ў «Джэнга», шашкі і іншыя настольныя гульні. СТАР. 3

Камунальныя стасункі

Калі домаўладанне — сумеснае

Завочнае галасаванне і электроннае апытанне

Для шматкватэрных жылых дамоў застаюцца два спосабы кіравання — з дапамогай самаарганізацыі (стварэння таварыства ўласнікаў або жыллёва-будаўнічага кааператыва) і праз упаўнаважаную асобу — дзяржаўнага заказчыка. Дык вось, парадак прыняцця рашэнняў у сумесных домаўладаннях, у першую чаргу ў таварыствах уласнікаў, зменіцца. Гэта прадугледжана новай рэдакцыяй Жыллёвага кодэкса, якая была прынята сёлета ў пачатку мая, а ўступіць у сілу з 1 студзеня наступнага года. Як адзначыў начальнік упраўлення жыллёвай гаспадаркі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Андрэй РАМАШКА ў прэс-цэнтры БелТА, прынцыповай навізной гэтага дакумента з'яўляецца сістэматызацыя шэрагу прававых актаў, якія былі прыняты ў сферы жыллёвых адносін. СТАР. 2

КАРАТКА

- Чэкі «Маёмасць» з 1 ліпеня можна будзе абмяняць на акцыі яшчэ 25-і ААТ.
- **У мінскім аэрапорце 10 000 замежнікаў пачастуюць васільковым марозівам.**
- Жыхары амерыканскага штата Вірджынія 18 чэрвеня заўважылі ў небе над возерам Сміт Маўнцін рэдкую прыродную з'яву — хвалепадобныя аблокі.

- **«Беларуснафта» да Еўрапейскіх гульняў пабудавала ў Мінску 50 электразарадных станцый.**

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем цікавае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ – НЕ ПАШКАДУЕЦЕ!

ВІТАЕМ ВЫСОКІХ ГАСЦЕЙ

Мінск гасцінна сустракае спартсменаў, суддзяў і, вядома, балельшчыкаў, якія жадаюць на свае вочы назіраць буйны спартыўны форум — II Еўрапейскія гульні. Да ўрачыстай цырымоніі адкрыцця ў сталіцу прыбываюць і VIP-госці — з некаторымі з іх учора ў Палацы Незалежнасці сустрэўся Аляксандр Лукашэнка.

У ПАТРЭБНЫ МОМАНТ

Першым беларускі лідар прыняў старшыню Прэзідыума Босніі і Герцагавіны Міларада Додзіка.

Адзначым, што каманда Босніі і Герцагавіны на II Еўрапейскіх гульнях уключае 16 спартсменаў і 13 трэнераў. Баснійскія атлеты выступяць у такіх відах спорту, як веславанне на каноэ, бокс, дзюдо, тэніс, кулявая і стэндавая стральба, веласіпедны спорт.

Аляксандр Лукашэнка, выказаўшы шкадаванне, што даводзіцца рэдка сустракацца, падкрэсліў: гэтая сустрэча сапраўды да месца, якраз у патрэбны момант. «Мы ўважліва сочым за развіццём вашай краіны. Вы ведаеце маё меркаванне аб ранейшай Югаславіі, пра сітуацыю, якая ў Югаславіі складвалася, пра вашу краіну, пра Сербію, пра рэспублікі, якія ўваходзілі ў былую Югаславію, — сказаў Прэзідэнт. — У нас былі нядрэнныя адносіны з Югаславіяй, у нас нядрэнныя адносіны складваюцца з Сербіяй. У нас ёсць адносіны з Босніяй і Герцагавінай, але гэта недастаткова, мы можам значна больш, і вось у сувязі з гэтым ваш візіт вельмі важны і своечасовы».

Вядома, Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на іншую добрую нагоду — спорт. Паводле яго слоў, усе рэспублікі былой Югаславіі — паспяховыя з пункту гледжання спорту. Ён дадаў, што Беларусь вельмі многаму ў іх вучыцца ў розных відах спорту, у нас выступаюць спартсмены з гэтых дзяржаў, прыязджаюць і трэнеры, каб падзяліцца вопытам.

У адказ старшыня Прэзідыума Босніі і Герцагавіны адзначыў, што для яго вялікі гонар наведаць нашу краіну. Ён дадаў, што вельмі цэніць намаганні беларускага лідара — зрабіць краіну моцнай і паспяховай.

Міларад Додзік таксама сказаў, што гэта яго першы візіт у Беларусь. Калі ён прыехаў у Мінск, то ўбачыў вельмі прыгожы і чысты горад, а людзей на яго вуліцах ён назваў міралюбнымі і ўсмешлівымі. На яго думку, гэта сведчанне стабільнасці.

Крыху пазней, размаўляючы з журналістамі, Міларад Додзік падзяліўся падрабязнасцямі сустрэчы з Аляксандрам Лукашэнкам:

«Мы гаварылі аб супрацоўніцтве Босніі і Герцагавіны і Беларусі. Я ўдзячны яму за запрашэнне наведаць адкрыццё Гульняў. Размова са спадаром Прэзідэнтам была аб магчымым супрацоўніцтве ў гаспадарчым сектары, сектары новых тэхналогій. Таксама ў нас была размова па палітычных пытаннях аб тым, што адбываецца ў свеце, на тэрыторыі былой Югаславіі. І прыйшлі да высновы, што самае галоўнае — гэта мір паміж людзьмі і спакой паміж нацыянальнасцямі. Самае галоўнае — гэта стабільнасць».

СЯБРЫ ЗАЎСЁДЫ ПОБАЧ

Таксама кіраўнік дзяржавы сустрэўся з прэзідэнтам Малдовы Ігарам Дадонам.

Аляксандр Лукашэнка перш-наперш падзякаваў малдаўскаму калегу за візіт, які адбыўся пасля ўсіх бурных падзей у яго рэспубліцы, і павіншаваў з годным выйсцем з няпростага, складанага становішча. Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены: малдаване — малайцы, таму што захавалі еднасць. Краіна пазбегла найцяжэйшай спадчыны, якую магла б атрымаць у будучыні. «Вы проста разумныя людзі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Беларускі Прэзідэнт звярнуў увагу Ігара Дадона: «Нагода ў нас добрая — спорт. Ён заўсёды аб'ядноўваў людзей. Вельмі хочацца, каб ён садзейнічаў аб'яднанню ў цэлым у нашым рэгіёне. Я не магу сказаць пра Малдову і Беларусь — мы і так аб'яднаныя, вельмі блізкія з пункту гледжання эканомікі». У палітычным плане краіны прытрымліваюцца аднаго парадку дня.

На думку Аляксандра Лукашэнкі, уладзе Малдовы давядзецца яшчэ шмат пераадолець, каб узняць дабрабыт малдаван. Прэзідэнт запэўніў, што Беларусь гатовая і далей супрацоўнічаць на карысць народаў, каб абодва багацелі.

Ігар Дадон прызнаўся, звяртаючыся да беларускага калегі: «Ваша меркаванне аб тым, што ў нас адбываецца, і ваша ацэнка для мяне асабіста і для малдаўскага народа вельмі важныя». «Мы атрымалі шанц, які, магчыма, даецца аднойчы. І мы павінны яго выкарыстаць. У Малдове ўсё будзе добра», — адзначыў Ігар Дадон. Ён падкрэсліў: «У нас выдатныя двухбаковыя адносіны на ўзроўні прэзідэнтаў з першага дня знаёмства, калі мы бачыліся ў Бішкеку ў красавіку 2017 года. Я хацеў бы, каб у Малдове было так, як у Беларусі. Таму, калі я атрымаў запрашэнне прыехаць на важную падзею — для вас, для краіны — нягледзячы на няпростыя часы ў Малдове, я вырашыў быць побач з вамі. Таму што сябры звычайна побач адзін з адным — і ў бядзе, і ў радасці».

У Малдове Аляксандра Лукашэнку вельмі любяць і чакаюць, адзначыў Ігар Дадон і запрасіў беларускага кіраўніка восенню наведаць яго краіну.

У II Еўрапейскіх гульнях ад Малдовы ўдзельнічаюць 50 спартсменаў і 44 трэнеры. Малдаўскія атлеты выступяць у кулявой і стэндавай стральбе, каратэ, спрынце, боксе, дзюдо, настольным тэнісе і бадмінтоне, а ў вольнай барацьбе, веславанні на байдарках і каноэ, самба будуць прэтэндаваць на заваяванне медалёў.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.
Варвара МАРОЗАВА.

ПЫТАННІ І АДКАЗЫ

Традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца 22 чэрвеня ў аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме. На званкі адкажуць з 9.00 да 12.00:

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Вадзім Іванавіч АЛЬШЭЎСКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Барыс Сяргеевіч ЯФРЭМАЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

кіраўнік спраў ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Алена Уладзіміраўна КЛІЧКОЎСКАЯ. Тэл. 8 023 233 12 37;

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Іосіфавіч ДЗЯШКО. Тэл. 8 015 273 56 44;

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Андрэй Міхайлавіч КУНЦЭВІЧ. Тэл. 8 022 250 18 69;

кіраўнік спраў МІНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ГУРЫНОВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Аляксандр Вікенцьевіч ДАРАХОВІЧ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Калі домаўладанне — сумеснае

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У дакументе дадзены больш выразныя азначэнні паняцця «кіраванне сумесным домаўладаннем», паслуг, на падставе якіх таварыства ўласнікаў або ўпаўнаважаная асоба забяспечвае арганізацыю эксплуатацыі жыллёвага фонду. Таксама аблягчаецца працэс прыняцця рашэнняў па асноўных пытаннях дзейнасці — зніжаецца парог як яўкі на агульны сход, так і галасавання.

Зніжаны і кворум па прыняцці рашэнняў аб адчужэнні агульнай маёмасці пры рэканструкцыі. «Таксама будзе патрабавацца згода дзвюх трацін удзельнікаў, тады як цяпер — 100 %. Гэта спросціць перадачу часткі агульнай маёмасці ў карыстанне аднаму або некалькім членам таварыства», — растлумачыў Андрэй Рамашка. Як прыклад ён прывёў выпадкі, калі ёсць магчымасць далучыць да жылога памяшкання тэхнічны паверх.

Яшчэ адно новаўвядзенне Жыллёвага кодэкса — спрашчэнне парадку прыняцця рашэнняў. У прыватнасці, завочнае галасаванне дапаўняецца электронным апытаннем. Такімі праграмамі ўжо карыстаюцца многія таварыствы. Таксама на вочных сходах дадзена права прагаласаваць датэрмінова.

Усяго ў нашай краіне налічваецца каля 4 тысяч таварыстваў уласнікаў і 6 тысяч кааператываў, большасць з якіх размешчана ў Мінску. На прынцыпах самаабслугоўвання працуе каля 43 % з іх, 57 % заключылі дагаворы на абслугоўванне з арганізацыямі камунальнай формы ўласнасці. Па словах Андрэя Рамашкі, у апошнія гады дынаміка стварэння таварыстваў уласнікаў і кааператываў некалькі запаволілася.

Кодэкс пашырыць магчымасці абароны нашых правоў

Прыняцце новай рэдакцыі Жыллёвага кодэкса запатрабуе ўнясення змяненняў у больш чым 100 дакументаў. «Вельмі вялікі пералік нарматыўных прававых актаў падлягае змене. Усё, што супярэчыць кодэксу, падлягае альбо карэкціроўцы, альбо адмене», — адзначыў Андрэй Рамашка. — У прыватнасці, уносяцца змяненні і дапаўненні ў Закон «Аб абароне правоў спажыўцоў жыллёва-камунальных паслуг».

Папраўкі канкрэтызуюць віды ЖКП, крытэрыі іх якасці, правы і абавязкі спажыўцоў і пастаўшчыкоў гэтых паслуг, што пашырае магчымасці грамадзян для абароны сваіх правоў. Чакаецца, што восенню дэпутаты прымуць праект дакумента ў другім чытанні. Будзе адменены Указ № 538 «Аб некаторых пытаннях дзейнасці таварыстваў уласнікаў і арганізацый забудоўшчыкаў».

Жыхары блакіраваных дамоў на капітальны рамонт могуць і не «скідацца»

Уладальнікі так званых таўнхаусаў цяпер змогуць ствараць таварыствы ўласнікаў. Спецыяліст адзначыў, што сёння ў краіне вядзецца будаўніцтва такіх кварталаў, якія складаюцца не толькі з аднакватэрных жылых дамоў. У новай рэдакцыі Жыллёвага кодэкса прапісана, што жыхары групы блакіраваных жылых дамоў, размешчаных на агульнай тэрыторыі, змогуць аб'ядноўвацца ў таварыствы ўласнікаў. «Дзеючая рэдакцыя не прадугледжвала такой магчымасці», — адзначыў Андрэй Рамашка. Таксама ўласнікі часткі блакіраваных жылых дамоў будуць вызваляцца ад платы за капітальны рамонт. Пакуль жыхары прыватнага домаўладання ўносяць яе разам з наймальнікамі памяшканняў дзяржжылфонду. «Гэты абавязак для ўласнікаў цяпер выключаецца», — дадаў прадстаўнік міністэрства.

Таўнхаус (ад англійскага town house — дом у горадзе) гэта шматкватэрны дом нізкай паверхавасці, дзе ў кожнай кватэры маецца невялікі зялёны дворык. Фактычна можна лічыць таўнхаусы «шматкватэрнымі катэджамі».

Таварыствы ўласнікаў усё часцей выбіраюць дагавор з дзяржструктурамі

«Дынаміка прыходу прыватнікаў на рынак жыллёва-камунальных паслуг ёсць, але яна недастаткова актыўная, — адзначыў спецыяліст. — На сённяшні дзень толькі крыху больш за 20 камерцыйных, прыватных арганізацый аказваюць паслугі па тэхнічным абслугоўванні жыллёвага фонду, санітарным утрыманні дапаможных памяшканняў».

Стрымальным фактарам для развіцця канкурэнцыі ён назваў тое, што сфера ЖКП датуецца з бюджэту. Фактычна выдаткі акупляюцца толькі па тарыфах на тэхнічнае абслугоўванне. У апошнія гады назіраецца тэндэнцыя, калі ўсё большая колькасць таварыстваў уласнікаў аддае перавагу заключэнню дагавораў на абслугоўванне з камунальнымі арганізацыямі. «Гэта абыходзіцца танней, чым плаціць заработную плату сваім работнікам», — дадаў ён.

Сяргей КУРКАЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Еўракамісія збіраецца ўвесці санкцыі ў дачыненні да Італіі

На думку выканаўчага органа ЕС, італьянскія ўлады не жадаюць прытрымлівацца рэкамендацый Еўрасаюза па скарачэнні бюджэтнага дэфіцыту і знешняга доўгу. Адзін з ініцыятараў такіх крайніх мер у дачыненні да Італіі — еўракамісар па эканоміцы і фінансах П'ер Маскавісі: «Мы настроены сур'ёзна. Мы гатовыя ўжыць неабходныя дысцыплінарныя меры супраць Італіі. І мы ўжо прыступілі да гэтага. Я разлічваю на тое, што гэтыя меры будуць недвухсэнсоўныя, і што міністры мяне падтрымаюць. Пакуль гэтага працэсу можна пазбегнуць, і ўсе б гэтага хацелі». Вось ужо 20 гадоў у Італіі не расце ўзровень жыцця. Краіна займае трэцяе месца па ўзроўні беспрацоўя ў ЕС, а знешні доўг краіны, паводле матэрыялаў Еўракамісіі, адзін з самых высокіх у свеце і другі ў Еўрасаюзе.

Прэзідэнт Мексікі прызначыў рэферэндум аб даверы да сябе

Андрэс Мануэль Лопес Абрадор выступіў з прапановай арганізаваць усенароднае галасаванне пра давер да сябе ў якасці кіраўніка дзяржавы 21 сакавіка 2021 года. Прэзідэнт Мексікі агучыў яго падчас прэс-канферэнцыі ў Мехіка, трансляцыя вялася на яго старонцы ў «Твітэры». Паводле слоў Абрадора, на галасаванне неабходна выставіць пытанне, «заставацца яму на чале краіны або сыходзіць у адстаўку». Такім чынам ён мае намер даведацца, ці ўхваляюць грамадзяне работу ўрада. Да канца сакавіка 2021 года Лопес Абрадор прабудзе на пасадзе кіраўніка дзяржавы крыху менш за палову свайго прэзідэнцкага тэрміну. Прапанаваная дата абраная невыпадкова: 21 сакавіка ў Мексіцы адзначаюць дзень нараджэння нацыянальнага героя, 49-га прэзідэнта Беніта Хуарэса, які кіраваў краінай з 1858-га да 1872 года. Прэзідэнт Мексікі абіраецца на шэсць гадоў. Лопес Абрадор уступіў на пасаду кіраўніка краіны 1 снежня 2018-га.

Улады Новай Зеландыі выдаткуюць больш за $130 млн на выкуп зброі ў насельніцтва

Урад Новай Зеландыі ініцыяваў маштабную кампанію па выкупе ў насельніцтва паўаўтаматычнай зброі. Пра гэта паведаміла выданне «Нью Зіленд геральд» са спасылкай на міністра паліцыі краіны Сцюарта Нэша. Паводле яго слоў, плануецца выкупіць сотні тыпаў зброі, а таксама магазіны для патронаў вялікай ёмістасці і іншыя боепрыпасы. На гэтыя мэты ў бюджэце ўжо прадугледжана 190 млн новазеландскіх долараў ($123 млн). Яшчэ 18 млн ($11,6 млн) будуць выдаткаваныя на збор зброі. Як паведаміў кіраўнік ведамства, паліцыя апублікуе пералік зброі з указаннем кошту выкупу, які можа складаць да 95 працэнтаў ад яго рынкавага кошту і дасягаць 10 тысяч новазеландскіх долараў ($6,4 тыс.). Памер кампенсацыі будзе залежаць і ад стану зброі, а выплачвацца яна будзе толькі тым, у каго ёсць неабходныя дазволы.

Пляцоўка адпачынку з настроем

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Для аматараў фота арганізатары стварылі некалькі маляўнічых фотазон. Сваю работу ў фан-зоне пачалі і пункты грамадскага харчавання, нацыянальную кухню ў дзень адкрыцця прадставілі пасольствы Турцыі і Італіі. Турэцкія кухары адзначылі, што асаблівай папулярнасцю ў беларусаў карыстаюцца іх нацыянальныя прысмакі. А вось у гасцей сталіцы наадварот попыт быў на беларускую кухню, таксама прадстаўленую ў фан-зоне.

Шматлюдна было ў зоне продажу сувенірнай прадукцыі: найбольшым попытам тут карыстаюцца фігуркі і мяккія цацкі ў выглядзе талісмана Гульняў лісяняці Лесіка, а таксама майкі і магніты, менш пакуль купляюць заплечнікі і сумкі.

Прыемна, што ў сувенірных крамах можна заўважыць як беларусаў, так і прыезджых гасцей.

«Беларуская сталіца асабліва прыгожая летам. Выдатна, што мы разам зможам паўдзельнічаць у гэтым грандыёзным спартыўным свяце, — адзначае **выканаўчы дырэктар II Еўрапейскіх гульняў Сайман КЛЕГ.** — *Гэта вельмі важны момант у спартыўнай гісторыі не толькі Еўропы, але і Беларусі. Хачу выказаць вялікую падзяку ўсім, хто прыняў удзел у арганізацыі II Еўрапейскіх гульняў: Дырэкцыі, Мінску, Адміністрацыі Прэзідэнта, Прэзідэнту».*

У дзённы час у фан-зонах будуць трансліраваць спаборніцтвы Гульняў, найлепшыя моманты спартыўных спаборніцтваў і медальных цырымоній, а па вечарах тут разгорнуцца канцэртныя пляцоўкі, дзе выступяць найлепшыя выканаўцы і калектывы. Далей у праграме работы фан-зоны каля Палаца спорту прэзентацыі НАКаў краін — удзельніц Еўрапейскіх гульняў, таксама там будуць прадстаўлены нацыянальныя кухні, рамёствы, тэатральныя калектывы і спартыўныя дасягненні гэтых краін.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.
Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Уладзімір Самсонаў — капітан і сцяганосец

Такое рашэнне было прынята на агульным сходзе ў штабе беларускай каманды ў Вёсцы атлетаў

Капітанам беларускай каманды і сцяганосцам нашай дэлегацыі ў час цырымоніі адкрыцця II Еўрапейскіх гульняў абраны славуты гулец у настольны тэніс удзельнік шасці Алімпійскіх гульняў, трохразовы ўладальнік Кубка свету, уладальнік прыза «Fair play», шматразовы чэмпіён і прызёр чэмпіянатаў Еўропы і свету Уладзімір Самсонаў.

«У Беларусі шмат выдатных спартсменаў, вартых быць сцяганосцам і капітанам. І гэта вельмі вялікі гонар для мяне, я ўдзячны за давер і павагу да нашага віду спорту, — адзначыў пазней сам Уладзімір. — Таксама хацеў бы пажадаць усім удачы на II Еўрапейскіх гульнях. Наўрад ці ва ўсіх нас будзе яшчэ адзін шанц удзельнічаць у спаборніцтвах такога ўзроўню ў сябе дома, побач з нашымі сем'ямі, роднымі і блізкімі. Усім жадаю вялікіх перамог!»

Клятву ад імя ўсіх спартсменаў падчас цырымоніі адкрыцця будзе зачытваць пераможца І Еўрапейскіх гульняў у жаночай барацьбе Васіліса Марзалюк. «Першая рэакцыя на гэта рашэнне — мільён пытанняў. Цікавіў змест прамовы, у чым я буду адзетая, хто мне дапаможа з арганізацыяй, — дзеліцца эмоцыямі Васіліса. — Калі атрымала адказы, прыйшло хваляванне. Для мяне гэта вялікі гонар, і я збяру ўвесь настрой, каб зрабіць усё правільна і прыгожа. Вельмі рада гэтаму рашэнню і ганаруся, што выбралі менавіта мяне».

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

Дайджэст

Што пішуць пра Еўрапейскія гульні замежныя СМІ

«Российская газета»

Мерны рытм жыцця і летні рэлакс — гэта не пра Мінск у другой палове чэрвеня. 21 чэрвеня ў беларускай сталіцы адкрываюцца II Еўрапейскія гульні, і горад ужо запоўнены заўзятарамі і транспартам з сімволікай гэтага найбуйнейшага міжнароднага форуму з удзелам больш чым 5000 атлетаў з 50 краін. Здаецца, што насельніцтва горада з 21 да 30 чэрвеня павялічыцца як мінімум удвая.

«Известия» (Расія)

На II Еўрапейскіх гульнях, якія стартуюць у пятніцу ў Мінску, расійскія спартсмены маюць намер паказаць найлепшыя вынікі ў большасці дысцыплін.

— Збіраемся пазмагацца за першае месца ў агульнакамандным заліку — усё для гэтага ў нас ёсць, — адзначыў прэзідэнт Алімпійскага камітэта Расіі Станіслаў Пазднякоў. — Усе нашы спартсмены настроены сур'ёзна. І склад у нас падабраўся моцны. Напрыклад, у Мінску за Расію выступяць 18 чалавек, якія заваявалі залатыя медалі на І Еўрапейскіх гульнях, што прайшлі чатыры гады таму ў Баку.

Le soir.be (Бельгія)

Трыццаць тры з пяцідзесяці спартсменаў зборнай Бельгіі, якія спаборнічаюць у Мінску, прыбылі ў беларускую сталіцу пад ясным сонцам. Сярод іх былі, у прыватнасці, дзюдаіст Тама Нікіфароф, дзеючы чэмпіён Еўропы ў вазе 100 кг, і Самі Шушы, віцэ-чэмпіён Еўропы (81 кг). Шарлін Ван Снік, уладальніца залатога медаля першых Еўрапейскіх гульняў, прыехала з Парыжа, дзе яна пражыла некалькі гадоў. Атлетаў, трэнераў і кіраўніцтва Алімпійскага і Міжфедэральнага камітэта Бельгіі сустрэў у аэрапорце кіраўнік місіі Герт Ван Лой, які ўжо некалькі дзён знаходзіцца на месцы. «Мы вельмі добра ўладкаваліся, і арганізацыя добрая. Нам няма на што скардзіцца», — сказаў Ван Лой.

SPUTNIK (Эстония)

Шматлікая дэлегацыя зборнай Эстоніі адправілася на II Еўрапейскія гульні ў горад Мінск з Талінскага аэрапорта. Эстонскія спартсмены ляцяць у сталіцу Беларусі з больш чым рэальнымі надзеямі на поспех. Канкурэнцыя вельмі высокая, але нават з улікам такой канкурэнцыі прадстаўнікі розных відаў спорту з Эстоніі гатовыя пазмагацца за медалі.

Усе спартыўныя сцягі да нас

У Ліёне разыгралі білеты на II Еўрапейскія гульні

У Францыі адбылася промаакцыя II Еўрапейскіх гульняў. Як паведамілі ў Пасольстве Беларусі ў Францыі, госці пазнаёміліся з Мінскам і падрыхтоўкай Беларусі да адной з галоўных спартыўных падзей Еўропы падчас падрабязнай прэзентацыі; даведаліся пра месцы і спосабы продажу білетаў, расклад спаборніцтваў і культурных мерапрыемстваў, а таксама пра магчымасці эканамічнага супрацоўніцтва і турыстычны патэнцыял Сінявокай.

Адпаведную атмасферу забяспечылі выступленне беларускай цымбалісткі Настассі Луневай і вернісаж твораў беларускіх мастакоў, што жывуць у Францыі: Ірыны Котавай, Вольгі Дземкінай, Наталлі Альховай і Аліны Альховай.

Зацікаўленасць у наведвальнікаў выклікаў розыгрыш білетаў на спартыўныя спаборніцтвы. У промаакцыі ўзялі ўдзел прэзідэнт Алімпійскага камітэта рэгіёна Аверань — Рона — Альпы, кіраўнік адміністрацыі 7-й акругі Ліёна, а таксама бізнесмены, спартыўныя функцыянеры, турыстычныя аператары, журналісты, прадстаўнікі беларускай дыяспары.

Варвара МАРОЗАВА.

Надвор'е

Спякота працягваецца

Гэта яшчэ добра, што ападкі актыўна прысутнічаюць

Сапраўды будзе ў нас горача, але з дажджамі і навальніцамі, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У суботу атмасферны фронт прынясе няўстойлівае надвор'е, з вялікімі кантрастамі тэмператур. На большай частцы тэрыторыі чакаюцца кароткачасовыя дажджы розных інтэнсіўнасці. Месцамі прагрымяць навальніцы. Уначы будзе ад плюс 15 да плюс 21 градуса, удзень — 20—27 цяпла. Месцамі, пераважна па паўднёвым усходзе, паветра прагрэецца да плюс 28—33 градусаў. Франтальны раздзел перамесціцца на паўднёвы ўсход краіны ў нядзелю, а за франтам распаўсюдзіцца больш свежае паветра з Балтыкі. Пераважна па паўднёва-ўсходняй палове краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы, месцамі навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 11 градусаў па паўночным захадзе да плюс 20 градусаў па паўднёвым усходзе краіны. Днём будзе ў асноўным 19—26 цяпла, толькі па паўднёвым усходзе — 27—31 градус вышэй за нуль.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак надвор'е ў паўночна-заходняй частцы краіны абумовіць вобласць павышанага атмасфернага ціску, па паўднёва-ўсходняй палове захаваецца ўплыў атмасфернага фронту. Месцамі па паўднёвым усходзе краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымыя навальніцы. Уначы чакаецца 12—19 цяпла, удзень — ад плюс 20 градусаў па паўночным захадзе да плюс 32 па паўднёвым усходзе краіны.

Сяргей КУРКАЧ.

Беларусь памятае

ЗА ГАДЗІНУ ДА ВАЙНЫ

У Брэсце праходзяць мерапрыемствы, прысвечаныя Дню ўсенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны

Дата 22 чэрвеня для Брэста асаблівая. У гэты дзень успамінаюць абаронцаў крэпасці і ўсіх людзей, якія летнім выхадным днём прачнуліся не пад спевы птушак, а пад пякельны свіст і завыванне снарадаў. І ўжо больш за паўвека перад світаннем у крэпасць прыходзяць новыя пакаленні брастаўчан, шматлікія госці, каб прыгадаць тыя даўнія падзеі, аддаць даніну пашаны героям.

А напярэдадні гараджане збіраюцца на пешаходнай вуліцы Савецкай, дзе аднаўляецца апошні мірны вечар. У горад на гэтыя дні прыязджаюць дзясяткі рэканструктараў з розных краін. Разам з брэсцкімі ўдзельнікамі ваенна-гістарычных клубаў яны праводзяць дэфіле па Савецкай вуліцы ва ўборах даваеннага ўзору, праходзяць маршам па вуліцах Гогаля і Зубачова.

Атмасферу саракавых стварае гарадскі духавы аркестр. Сваю рэтра-праграму музыканты назвалі «Брэст даваенны». Канцэрт працягне ансамбль «Рамонкі» гарадскога цэнтра культуры. Тым часам каля выставачнай залы абласны краязнаўчы музей разгорне экспазіцыю «Мы для Перамогі нічога не пашкадуем», а музей гісторыі горада падрыхтаваў фотадакументальную выстаўку «Брэст гістарычны».

Гэтым разам мерапрыемствы «даваеннага дня» не абмежаваныя вуліцамі Савецкай, Гогаля, Зубачова. Былы Армейскі клуб на тэрыторыі крэпасці стане месцам правядзення спектакля «Пайсці і не вярнуцца». У парахавым склепе Кобрынскага ўмацавання сапраўды быў салдацкі клуб аж да лета 1941 года. Тут праходзілі канцэрты і пастаноўкі, куды збіраліся байцы. Клуб, несумненна, наведвалі і тыя, хто быў забіты, узяты ў палон, мужна абараняўся ў першы дзень нашэсця ворага.

Спектакль у тэатры аднавілі нядаўна пасля чатырохгадовага перапынку. Яго прэм'ера адбылася ў 2012 годзе. Зараз паказ прымеркавалі да 95-годдзя Васіля Быкава. У дзень нараджэння пісьменніка, 19 чэрвеня, спектакль адбыўся ў вялікай зале тэатра, а 21 чэрвеня паказ запланаваны ў армейскім клубе. Паводле выказвання рэжысёра-пастаноўшчыка Валянціны Янавец, пляцоўка пасуе да атмасферы спектакля. Аскетызм памяшкання, прахалода парахавога склепа дапамогуць адчуць складанасць і драматызм сітуацыі. Падзеі адбываюцца зімой 1942 года падчас цяжкіх баёў за Сталінград. Таму варта паглядзець «Пайсці і не вярнуцца» менавіта ў армейскім клубе. Трэба сказаць, што названая пастаноўка — не першая культурная акцыя ў крэпасці напярэдадні 22 чэрвеня. Напрыклад, у 2008 годзе ў дзве гадзіны ночы пачалася прэм'ера фільма «Брэсцкая крэпасць» Ігара Угольнікава. Па сіле эмацыйнага ўздзеяння тую прэм'еру цяжка параўнаць з нечым іншым...

А зараз спектакль пачнецца а шостай гадзіне вечара. Праз гадзіну, роўна ў сем, каля помніка вартавым мяжы пройдзе патрыятычная акцыя «Баявы разлік» у памяць аб салдатах і афіцэрах памежных застаў, якія загінулі 22 чэрвеня. Яны, як і абаронцы крэпасці, прымалі першыя, самыя цяжкія баі. У іх быў загад — не саступаць ні пядзі зямлі. І яны не саступалі, пакуль жылі. Іх подзвіг не забыты. Таму ўжо трэці год у крэпасць прыязджаюць курсанты Інстытута пагранічнай службы, каб каля Цярэспальскіх варот паказаць баявы разлік — памежны рытуал, які праводзіцца пры заступленні вайскоўцаў на службу па ахове Дзяржаўнай мяжы на кожнай заставе роўна ў 19 гадзін. Толькі на сімвалічным баявым разліку курсанты трымаюць партрэты вартавых мяжы, якія загінулі ў першыя дні вайны. Яны нібы зноў заступаюць на службу... навечна.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

900 СТАРОНАК НЕЗАБЫЎНАГА

У Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны прайшло ўзнагароджанне пераможцаў і фіналістаў конкурсу «Франтавы альбом», прысвечанага 75-й гадавіне вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

З усіх куткоў Беларусі людзі дасылалі творчыя работы, якія аздаблялі фотаздымкамі з сямейных альбомаў. Конкурс праводзіўся ў рамках рэспубліканскай акцыі «Беларусь памятае» і быў арганізаваны Беларускім тэлеграфным агенцтвам, рэдакцыяй газеты «7 дней» сумесна з Міністэрствам адукацыі Беларусі, Нацыянальным цэнтрам мастацкай творчасці дзяцей і моладзі і кампаніяй «Гейм Стрым». «Калі мы кажам пра патрыятызм, заўсёды адзначаем, што пачынаць трэба з сябе — а значыць, памятаць нашых продкаў, ведаць, як яны жылі. Дзякуючы такім праектам мы разумеем ролю кожнага з нас у агульнай карціне свету і тое, як важна захаваць мір», — заўважыла **першы намеснік міністра адукацыі Ірына СТАРАВОЙТАВА.**

На конкурс прыйшло 900 гісторый. Сярод аўтараў работ — людзі розных узростаў і прафесій, шмат маладых даследчыкаў. І калі раней на падобныя конкурсы людзі ў асноўным дасылалі ўспаміны, запісаныя ад сведкаў і ўдзельнікаў ваенных падзей, то сёлета «Франтавы альбом» папаўняўся інфармацыяй, адшуканай у архівах маладымі людзьмі, якія спрабавалі больш даведацца пра ваенны лёс сваіх родных.

Святлана ПАЛУПАНА расказала, чаму вырашыла ўдзельнічаць у конкурсе: «Па-першае, я ўнучка двух дзядоў, якія ваявалі. Адзін быў партызанам, другі — воінам Чырвонай Арміі. Па-другое, я маці цудоўнага дзіцяці і ўпэўнена, што новыя пакаленні павінны памятаць герояў вайны. Па-трэцяе, я настаўнік, і гэта мой абавязак — расказваць пра вайну. Заўсёды хвалююся, нават часам плачу, калі такая тэматыка выхаваўчых мерапрыемстваў. І бачу, наколькі гэта важна для дзяцей: яны даведваюцца, што народам быў здзейснены вялікі подзвіг падчас вайны і што трэба берагчы тое мірнае неба, якое нам перадалі». Дарэчы, Святлана Генадзьеўна даслала на конкурс дзве работы — уласную і падрыхтаваную разам з вучнямі.

Адзін з найлепшых праектаў на конкурс прыйшоў ад **настаўніцы з Асіповіцкага раёна Людмілы БАСКАВАЙ.** Сваю работу яна аформіла як размову з бацькам: «Мой тата — ветэран вайны. Я захоўваю яго ордэны і медалі. Пайшоў на фронт добраахвотнікам (ён з дваццаць чацвёртага года, таму яго не прызывалі). Са мной яго няма ўжо больш за сорак гадоў. Чым далей ідзе час, тым больш сумую, усё не хапае яго. Праз конкурс я хацела паказаць, наколькі ён мне дарагі, і падзякаваць яму і іншым за тое, што падарылі нам жыццё».

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Небяспечнае лета

Вада забірае п'яных

Большасць з тых, хто патануў сёлета, былі пад градусам, ахвярамі бесклапотнасці нецвярозых бацькоў сталі і дзеці

У крыві маці, двухгадовы сын якой патануў на гэтым тыдні на возеры Белым у Бешанковіцкім раёне, было 3,6 праміле алкаголю. Зараз 30-гадовая жанчына, якая, дарэчы, таксама танула, але яе ўдалося выратаваць, знаходзіцца ў ізалятары, праводзяцца мерапрыемствы па ўстанаўленні яе віны. Пра трагедыі, да якіх прыводзіць сумяшчэнне летняга адпачынку на прыродзе з алкаголем, расказалі спецыялісты.

З пачатку года ў Беларусі патанула 159 чалавек (сярод іх 17 непаўналетніх). У тым ліку падчас купання загінула 46 чалавек (трое дзяцей). 90 % людзей гіне ў неарганізаваных і забароненых для купання месцах. Каля 60 % загінулых знаходзіліся ў стане алкагольнага ап'янення. Выратаваць пры гэтым удалося больш за 130 чалавек.

— У параўнанні з мінулым годам у нас назіраецца рост колькасці загінулых — на 28 чалавек, — адзначае **старшыня Беларускага рэспубліканскага таварыства выратавання на водах (АСВОД) Анвар ІГАМБЕРДЫЕЎ.** — Прычым сыграў сваю ролю анамальна спякотны перыяд — за тыдзень у краіне патанула 46 чалавек. Выратаваць удалося 19.

Найчасцей прычынай гібелі дзяцей становіцца нядбайнасць дарослых. На возеры Каташы пад Кобрынам патануў шасцігадовы хлопчык. Купацца ён пайшоў у суправаджэнні айчыма і двухгадовай сястры. Мужчына ў пэўны момант страціў яго з поля зроку, хлопчык зайшоў у чарот і патануў «на роўным месцы». Гэтак жа загінуў пяцігадовы малы на сажалцы ў Мікашэвіцкім раёне. У Магілёўскай вобласці двое братоў 6 і 11 гадоў каталіся на ровары. Малодшы падышоў да вады і паслізнуўся на бетонным пакрыцці, старэйшы кінуўся на дапамогу. У выніку абодвы хлопчыкі патанулі ў 3,5-метровай яме.

Выпадкаў, калі дзеці гінуць з-за недагляду бацькоў і дарослых, вельмі шмат. Таму спецыялісты раяць выбіраць толькі арганізаваныя месцы для купання, не выпускаць з поля зроку дзяцей, а малых, якія не ўмеюць плаваць, трымаць у вадзе за руку. А таксама памятаць, да якіх трагедый можа прывесці ўжыванне алкаголю падчас адпачынку на вадаёмах.

Таксама спецыялісты нагадваюць пра неабходнасць выкарыстання выратавальных камізэлек падчас знаходжання ў лодках, яхтах і іншых плавальных сродках. І прыводзяць прыклад, калі на возеры Нарач перакулілася яхта з групай кітайскіх турыстаў. Усіх іх удалося выратаваць, бо яны былі ў камізэльках. А вось пажылой пары, якая адзначала дзень нараджэння ў лодцы на тым жа возеры, выжыць не ўдалося — выратавальныя камізэлькі знаходзіліся ў лодцы, а надзець іх людзі не пажадалі. Навыкаў мужчыны не хапіла, каб выратаваць сваю спадарожніцу, і на глыбіні шасці метраў абодва загінулі.

Раўнадушша дарослых таксама часта становіцца прычынай гібелі.

— У Бярэзінскім раёне школьнік упаў з тарзанкі. Побач сядзеў рыбак з вудачкай і нават не зварухнуўся з месца. Сказаў, што сам не ўмее плаваць. А дзіця патанула каля берага, дастаткова было зрабіць некалькі крокаў ці працягнуць веду. Ну як так можна? — здзіўляецца старшыня АСВОДа.

Нярэдка бравада абарочваецца трагедыяй і для дзяцей, і для дарослых.

— Скачуць у ваду, ныраюць, у выніку ламаюць пазванкі, атрымліваюць іншыя віды траўмаў, — кажа Анвар Ігамбердыеў. — Дарослыя садзяць дзяцей, якія не ўмеюць плаваць, на спіну і пераплываюць раку. Пачынаюць тануць і аказваюцца перад выбарам: каго выратоўваць — сябе ці дзіця?

Летам узрастае колькасць траўмаў шыйнага аддзела пазваночніка.

— Зараз трэць пацыентаў у рэанімацыі РНПЦ траўматалогіі і артапедыі — са спінальнымі траўмамі, — працягвае **галоўны спецыяліст упраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Сяргей АЎДЗЕЙ.**

Справа ў тым, што пацыент амаль не аднаўляецца пасля пералому шыйнага аддзела пазваночніка, асабліва калі адбылося пашкоджанне спіннога мозгу. І са здаровага чалавека ператвараецца ў інваліда на калясцы.

— Чалавек у стане алкагольнага ап'янення неадэкватна ацэньвае сітуацыю, і часта такія траўмы атрымліваюць п'яныя нырцы, — расказвае **вядучы навуковы супрацоўнік неўралагічнага аддзела РНПЦ неўралогіі і нейрахірургіі, кандыдат медыцынскіх навук Глеб ЗАБРОДЗЕЦ.** — Такі чалавек не кантралюе сябе, што прыводзіць і да цеплавых і сонечных удараў. Наступствы не такія страшныя, аднак і гэта вядзе да шпіталізацыі.

Трэба памятаць, што ў анамальную спякоту, а такой для Беларусі з'яўляецца надвор'е з тэмпературай 30 градусаў і вышэй, наш арганізм знаходзіцца пад асаблівай нагрузкай. Усе органы працуюць з напружаннем, асабліва сардэчна-сасудзістая сістэма.

— Ужыванне вадкасці — найлепшая прафілактыка. Здаецца, што халодны алкаголь паляпшае наш стан. Аднак гэта вялікая памылка. Алкаголь узмацняе смагу і пагаршае стан арганізма, — папярэджвае **намеснік галоўнага ўрача Гарадскога клінічнага наркалагічнага дыспансера Жанна ІСТОМІНА.**

Асабліва эксперт не раіць ужываць алкаголь у дзённыя гадзіны. Па магчымасці знаходзіцца ў памяшканні, дзе ёсць кандыцыянеры ці свежыя патокі паветра. А наталяць смагу ўсё ж лепш за ўсё вадой.

Алена КРАВЕЦ.



ТРЭБА ВЯРТАЦЦА Ў ДЗЯЦІНСТВА

Лета — пара адпачынкаў, паездак, сустрэч, найчасцей, вядома ж, чаканых. Я, напрыклад, амаль штогод бачу, як дзве дарослыя, скажам так, жанчыны, прыехаўшы ў водпуск у родную вёску, адна да адной кідаюцца ў абдымкі, чую, як ледзь не крычаць:

— Прывітанне, мая Краснапёрачка!

— Прывітанне, Карасік!

...Мянушкі гэтыя прыліпліі да кабет даўно, калі яны, дванаццацігадовыя, падаліся на рыбу.

Рыштунак сабе доўга не шукалі. Позірк Лены спыніўся на кломлі (так у нас звалі «складанку» з трохкутнікаў, збітых па вуглах тонкімі планкамі і абцягнутых сеткай. Зараз такіх, мусіць, не робяць ды і лавіць імі забаронена. А некалі кломлі былі на кожным падворку. Гаспадары з імі хадзілі на рыбу, гаспадыні — гадавалі куранят...)

Дык вось, іх маленькіх, дзяўчынкі перанеслі пад вялікі кошык. Самі, каб не парэзацца асакой, «прыбраліся» ў горшае адзенне, абулі кеды, на шыі павесілі па торбе для рыб і гародамі, каб ніхто не ўбачыў, рушылі да возера.

Лавіць стараліся так, як гэта рабілі дарослыя дзядзькі, — перайшлі іхнія рухі. І самае цікавае, што ў дзяўчат атрымалася: з першага ж заходу злавілі некалькі карасікаў, потым яшчэ.

Праз пэўны час вырашылі паглядзець, што ловіцца ў Шчары — гэта рака паблізу іхняга возера. Там, каля берага, была сцяна з аеру ды чароту, над ёй віліся матылькі...

Дзяўчаткам не хацелася парушаць такое харство, аднак рыбакі — людзі азартныя. Узяўшыся за кломлю, Лена з Аняй зрабілі адзін заход, потым другі, трэці, і ў сетцы забілі хвастамі дзве рыбкі-краснапёркі, потым невялікі шчупачок, дватры акункі...

Урэшце, прыкінуўшы, што гэтага ўлову ўжо дастаткова, дзяўчынкі (і зноў жа гародамі, каб ніхто не ўбачыў, бо рыбалка ў вёсцы справа не жаночая, а тым больш не дзявочая) рушылі дахаты. Там яны самі паскрэблі і пасмажылі рыбу. Атрымалася — ну вельмі смачна!.. Так што ўражанні ад рыбалкі азмрочвала хіба адно: бліжэй да вечара ўся вёска ўжо ведала, што Лена Колікава і Аня Аркадзікава хадзілі на рыбу, што налавілі шмат і што адну дзяўчынку з той самай рыбалкі завуць... Карасікам, а другую Краснапёркай.

Спачатку сяброўкі крыўдавалі на свае мянушкі, потым змірыліся, а цяпер дык нават ганарацца, бо не ўвесь жа час быць Аленай Мікалаеўнай ды Ганнай Аркадзеўнай. Трэба вяртацца ў дзяцінства!

Ірына Салата,

г. Гродна.

НАШ ДОБРЫ СЯБРА — УРДАН

Кажуць, што кватэры бываюць горшыя, чым турмы. Наша па тым часе была, здаецца, найлепшай! Яна пачыналася з маленькай вітальні (усю плошчу якой, прылёгшы, займала аўчарка), далей ішлі кухня (елі ў ёй па чарзе, бо чатыры чалавекі за стол не садзіліся) і два пакоі: у большым, але прахадным жылі бацькі майго мужа, а меншы адразу пасля вяселля яны ўступілі нам. Добрыя людзі! Грэх на іх скардзіцца, але ж і ўявіць...

Першыя чатыры месяцы наша дачушка жыла ў нашым пакоі, а потым, калі добра пацяплела, мяне (20 гадоў, 45 кілаграмаў вагі) з такім вось дзіцяткам і сабакам адвезлі на дачу аж за семдзесят кіламетраў ад Мінска.

Людзі там, вядома ж, былі, нават многа, але ж ні табе вады (халодная — у калонцы праз вуліцу), ні пральнай машыны, ні крамы, ні паліклінікі, ні тэлефонаў, ні памперсаў, ні падмогі...

Зрэшты, вось тут я трошкі хлушу, бо ў будныя дні (на два выхадныя прыязджала сям'я) адзін памочнік усё-такі быў. Каляску з дзіцем я магла спакойна даверыць сабаку. Ён жа, наш разумнік Урдан, як толькі малая пачынала варочацца ці плакаць, падаваў мне голас: заводзіў сваё працяжнае «гр-р-р-р» альбо ціха падвываў, а калі яшчэ і гаўкаў — мне трэба было спяшацца...

Карацей, для нас ён рабіў нямала, але гэта было не ўсё.

Неяк у пагодны выхадны мы пакіравалі ў недалёкі лес. Каляску з дачушкай (яна спакойна спала) пакінулі пры сцежцы, самі разышліся абапал, каб пазбіраць чарніцы, як раптам наш Урдан забурчаў і нават загаўкаў. «Пакрыўдзіўся, што не ўзялі з сабой, што не з намі», — прызнала свякроў. «...Альбо здурнеў», — дадаў свёкар ды яшчэ і прыгразіў: заткніся, маўляў, а то малую пабудзіш!

Сабака — нават не падумаў: ён чамусьці працягваў брахаць, так што я адразу ж вярнулася да каляскі і... ледзь не самлела: верх яе быў накрыты, можна сказаць, жывой рухомай «хусцінай»... з вялікіх чорных мурашоў. І гэта шчасце, што Урдан быў побач, а я блізка, што дзяцей тады спавівалі: мурашкі проста не паспелі нашкодзіць...

Гэта — адзін выпадак, зараз — другі.

Аднойчы, ужо добра пад восень, я стала гатаваць абед. Дачушка з Урданам заставаліся на дварэ, і праз акно я бачыла, што малая поўзае па дыванку, што сабака на варце, што па вуліцы, міма нашага доміка, пайшоў народ з электрычкі (машын тады мала было)... Потым — што суседчына дачка адчыняе брамку, заходзіць да нас у двор, вітаецца з Урданам і маленькай Машай, лёгенька шлёпае дзіця па адстаўленай «пятай кропцы» і...

У той жа момант сабака збівае жанчыну з ног, усім целам прыціскае да зямлі.

— Урдаша, пусці, — просіцца тая, — ты не так зразумеў... Я ж пагладзіць Машу хацела, а ты што падумаў?

Тут трэ было бачыць морду сабакі! «Бура» пачуццяў! З аднаго боку ён адчуваў сваю правату, з другога — віну, а галоўнае — не ведаў, што рабіць далей, пакуль да іх, у тую ж «кучу», не «ўвалілася» мая Машуля, а потым і я. Усе разам мы качаліся ад смеху...

На вялікі жаль, дачушка ў мяне ўсяго адна. Гадаваць яе, ну вядома ж, дапамагалі бабулі-дзядулі. Часам яны, што называецца, сядзелі з унучкай, вадзілі ў садок, сустракалі са школы, забіралі на канікулы...

Але ж, апроч іх, я заўжды з удзячнасцю ўспамінаю сабаку.

Людміла Сенька,

г. Мінск.

«І НОЧ... ВЯСЁЛАЯ БЫЛА»

Годзе мо ў 1935-м мае бацькі працавалі ў саўгасе «Камунар», маці, апроч іншага, адказвала за выпуск газеты «Камунаравец» і час ад часу ездзіла ў гарадскі пасёлак Уваравічы — там была друкарня. А неяк узімку (раней зімы былі снежныя ды марозныя — не тое што цяпер) узяла з сабой і мяне.

Помню, што дабіраліся мы на кані, запрэжаным у сані, што, прыехаўшы, спыніліся ў маміных знаёмых Кацярыны і Паўла, якія жылі ў маленькім здымным пакойчыку. З мэблі ў ім стаялі шафа і ложак, упрытык да яго — стол і знізу дзве табурэткі.

Усё гэта як зараз бачу, бо мама на нейкі час пакінула мяне ў тым пакоі, а сама паехала па справах.

Потым, па дарозе назад і ўсё парабіўшы, яна зайшлася на рынак: купіла там замарожаных уюноў. У Каці яны рыбу гэту падзялілі на дзве часткі: адну мама забрала сабе, другую — склала ў міску і пакінула на стале. Пасля гэтага (дзень кароткі) мы з ёй хуценька сабраліся і адвіталіся.

Дамоў, наколькі помню, даехалі без ніякіх прыгод, бо яны... засталіся ў Каці. Яна сама расказвала, як вечарам, пасля нашага ад'езду, лягла з мужам спаць (рыба заставалася на стале, бо халадзільнікаў тады не было), як ноччу ўюны размарозіліся і сталі выскокваць з міскі: спачатку — на стол, са стала — на падлогу. Некалькі рыбін (стол, паўтаруся, стаяў упрытык) звалілася на пасцель...

Карацей, у чарговы раз павярнуўшыся, Каця «напаролася» на нешта халоднае і слізкае. Сцепанулася, спужалася, саскочыла з ложка, басанож матнулася па запалкі (электрычнасці ў хаце таксама не было) і ўжо на падлозе «зачапіўшыся» за нешта халоднае і слізкае, заверашчала так...

— Каравул!.. Вужакі!

Ад піску ды гэтага крыку прачнуліся, здаецца, усе (можа, нават суседзі), што ўжо казаць пра мужа ды гаспадара.

Той, бедны, прыбег у пакой кватарантаў і стаў малаціць качаргой па падлозе... Яго жонка ўрэшце запаліла газніцу.

Пры святле, хай сабе цьмяным, Кацярына згледзела пустую міску і, прыпомніўшы, што ў ёй было, стала рагатаць.

Убачыўшы, з кім ён ваяваў, засмяяўся і гаспадар, за імі — гаспадыня і Павел. Так што ноч у іх атрымалася вясёлай.

Не да смеху было хіба што ўюнам, якіх раніцай збіраліся падсмажыць.

М. К. Любаскіна,

г. Бабруйск.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

АД ЯЕ Ж. ***Пры апошняй гісторыі ад шаноўнай спадарыні Любаскінай, якая помніць, як у 35-м годзе (уявілі ўзрост?) ездзіла ў гарадскі пасёлак Уваравічы, ёсць цікавыя радкі. Даслоўна: «Мне падабаецца чытаць «Звязду», а галоўнае — пісаць па-беларуску, — прызнаецца Міра Канстанцінаўна. — Здзіўляе толькі адно: адкуль прыходзяць патрэбныя словы?»***

Рытарычнае пытанне. Іх (ці ж не цуд?!) «падкідвае» памяць, «падказваюць» продкі... На жаль, не ўсім — тым, хто хоча іх слухаць. А таму, калі ласка, чытайце па-беларуску, пішыце і, дасылаючы лісты, не забывайце паведамляць нумары тэлефонаў — для аператыўнай зваротнай сувязі.

Неасабісты суб'ектыў

ФІЛАСОФІЯ СЕНАКОСУ

Пра што нагудзеў трымер

КАЛІ б Якуб Колас раздзел «Новай зямлі» «Летнім часам» пісаў сёння, замест «Ідуць касцы, звіняць іх косы» ў яго б дакладна было «Ідуць касцы, гудуць (як варыянт — равуць) іх косы». А можа, і ўвогуле пра гэта класік нічога б не пісаў. Бо сенакос з духмянага, роснага, нават рамантычнага дзейства ператварыўся ў спаборніцтва незразумелых істот у вялізных акулярах, якія, бы прышэльцы, павольна сунуцца па траве, махаючы перад сабой металічнай палкай, якая натужна ўзвывае. Трава не кладзецца ў пракосы, а, пасечаная на дробныя часткі, разлятаецца ва ўсе бакі. Прынамсі гэтак, напэўна, выглядала б сучасная ўсюдыісная карціна ў вачах Коласа ці кагосьці з яго герояў. Жах, дый годзе!..

А мы да яе літаральна за некалькі гадоў прызвычаіліся, нібыта так заўсёды і было. Прачынаешся раніцой у вёсцы — не птушыны спеў будзіць, а завыванне трымера. Добра, калі аднаго — руплівыя гаспадары любяць пакасіць траву, якая ледзь адскочыла на падворку, акурат у суботу ці нядзелю. Гэткая новая вясковая забаўка — і няцяжка, і ілюзія працы, і сваё гаспадарскае самалюбства пацешыць. Ды каб толькі мужчыны гэтак забаўляліся, яно было б зразумела: ім абы машынка, нават у выглядзе трымера. Але ж усё часцей з бензінавай ці электрычнай касой наперавес і прадстаўніцы «слабога» полу без мэты па двары соваюцца.

І, вы ведаеце, гэта заразна. Мяркую па сабе. У сям'і маладых мужчын, дзякуй богу, ужо хапае, і што падворак перад хатай ды ўзбочыны на вуліцы зарослыя б не былі — гэта дакладна. Але дзе там! У самой жа лепей атрымаецца. Самы важкі аргумент — кветкі. Ты іх сееш, садзіш, песціш, гадуеш, а мужык трымерам махане — і няма кветачак. Нават калі ты побач стаіш і рукамі махаеш — усё роўна злоўчыцца што-небудзь патрэбнае зрэзаць. Таму лепш самой — павольненька, акуратненька, не тузаючы. Да таго ж у мужчыны можа знайсціся сотня розных больш важных спраў — рыбалка, напрыклад, ці ў цяньку пад кустам паваляцца. А трава ж расце! У суседзяў двор выгалены, а ў тваім трава на пядзю — непарадак! А калі ўмееш абыходзіцца з трымерам — нікога ўгаворваць не трэба: пайшла сабе, пакасіла, а гультай хай ляжыць на баку ці на возеры стаіць, вочы вылупіўшы. Ён пасля, канешне, будзе абурацца, што не пачакала, але табе што — галоўнае, работа зроблена. Такая вось гендарная роўнасць. За звычайную касу наўрад ці так хутка хапалася б. Яе ж і накляпаць трэба, і патачыць у працэсе, а гэта нежаночая справа, бо досвед трэба мець. А так адзін неасцярожны рух асялком — і кавалка наманікюранага пазногця (у лепшым выпадку) няма. Не, звычайная каса жаночых рук не любіць...

А трымер... Да яго пачынаеш ставіцца як да машыны. У мяне, напрыклад, ён свой, асабісты, я да яго нават дакранацца нікому не даю. Такая ў мяне лялечка — электрычны, лёгенькі, але магутнасць добрую мае, з зялёным кажухом. Заўжды дагледжаны — я яго пасля кожнай касьбы ў тазіку памыю (не падумайце, што зусім дурная, — канешне, ніжнюю частку, а не тую, дзе матор), вытру, на сонейку прасушу, у спальні ў закуток пастаўлю... Здарылася нядаўна бяда — згубілася ў траве ад яго адна штучка, без якой ні фрэзу ні прыкруціш, ні шпульку з лёскай. Дык я за два дні, ахвяруючы абедам, па ўсіх сэрвісных цэнтрах гойсала, штучку шукала. Мужыкі на мяне са здзіўленай павагай глядзелі. (А можа, са здзеклівай?)

Штучку тую мне ажно з самой Германіі вязуць на заказ, таму трэба чакаць. Значыць, і гэтыя выхадныя пройдуць без толку. А трава расце-расце, канюшынка-дзяцеліна ўжо красаваць пачала. Непарадак — на цэлую пядзю ад зямлі вырасла!..

І нібыта ў мінулым жыцці было — калі на тым жа падворку траву падгадоўвалі, каб пакасіўшы (звонкай звычайнай касой, канешне) каго-небудзь ёй пакарміць — трусікаў, напрыклад, ці карове ў яслі кінуць. І падворак быў заўсёды не паголена-калючы, а мяккі і шаўкавісты, і ўвечары мы, малыя, ішлі на яго мыць па расе пяткі, наладжваючы басанож вясёлыя скокі ў позніх прыцемках. А па вуліцы рыпелі цяжкія вазы з духмяным сенам, і, едучы на такім возе блізка-блізка да неба, вельмі здорава было прыдумваць, на каго ці на што падобныя аблокі, якія праплываюць перад вачыма. Увечары, калі бацька садзіўся кляпаць касу на адмысловай калодцы, звонкае рэха рассыпалася ў вербалозах ля крыніцы, і здавалася, што там нейкая чароўная істота стукае па крышталі... І было ціха-ціха, і прачынаўся ад спеву птушак ці ад гучнага «Выганяй!» таго, чыя чарга была пасвіць радоўку. І мужчыны ішлі ранкам з косамі на плячах, а жанчыны — з віламі і граблямі, і кожны рабіў тое, што яму належыць, і старанна вучыў гэтай навуцы сваіх дзяцей і ўнукаў з упэўненасцю, што ім абавязкова гэта ў жыцці спатрэбіцца...

Жанна Сямёнаўна з вёскі Сёмкава Мінскага раёна расказала, што яе маці дзевяноста два гады. У яе доме камунальнікі адрамантавалі каналізацыю, праклалі неабходныя сеткі і камунікацыі. З таго часу прайшло каля пяці гадоў. Але ў памяшканні немагчыма жыць, таму што будаўнікі не паклалі за сабой падлогу, якую разбурылі падчас рамонту. Прыбраць хібы яны нібыта не адмаўляюцца, абяцаюць кожны квартал. Ды воз і сёння тут.

Наталля Якубіцкая даручыла разабрацца ў сітуацыі мясцовым уладам. У прыватнасці, рашэннем пытання зоймуцца першы намеснік старшыні Мінскага райвыканкама Уладзімір Юргевіч і кіраўнік прадпрыемства ЖКГ Мінскай вобласці Васіль Шашок. А старшыня Мінскага раённага Савета дэпутатаў Юлія Бялянкіна возьме сітуацыю пад асабісты кантроль.

стар. 16

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Ініцыятыва вітаецца

Пры Гомельскім абласным Савеце дэпутатаў створаны маладзёжны Савет.

стар. 13

Клопат аб людзях

Найлепшая на Гомельшчыне стараста жыве ў палескай глыбінцы.

стар. 14

Рэсацыялізацыя магчымая

Як адаптуюцца да жыцця людзі з псіхічнымі асаблівасцямі.

стар. 15

Водгук як падарунак

Сучасныя тэхналогіі дапамагаюць наладзіць дыялог паміж грамадствам і ўладай.

стар. 16

ДА ФОРУМАЎ РЭГІЁНАЎ

ПЛЯЦОЎКА ДЛЯ ДЫЯЛОГУ

На мінулым тыдні ў Санкт-Пецярбургу адбылося сумеснае пасяджэнне арганізацыйных камітэтаў па падрыхтоўцы і правядзенні VI Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі.

Сустаршынёй аргкамітэта з беларускага боку з'яўляецца намеснік старшыні Савета Рэспублікі Мар'яна Шчоткіна, з расійскага — намеснік старшыні Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі Юрый Вараб'ёў.

Як паведамілі ў прэс-службе Савета Рэспублікі, на пасяджэнні абмяркоўвалася падрыхтоўка асноўных мерапрыемстваў форуму. Асаблівая ўвага ўдзельнікаў была аддадзена праграме пленарнага пасяджэння, у якім чакаецца ўдзел кіраўнікоў дзяржаў.

Мар'яна Шчоткіна паведаміла журналістам, што важнай часткай праграмы саміту стане Маладзёжны форум.

— Невыпадкова мы прыцягваем шмат моладзі, бо гэта — будучыня Саюзнай дзяржавы, пытанні пераемнасці, захавання агульнай гісторыі, — адзначыла яна. — У гэтым плане добрай пляцоўкай для прасоўвання маладзёжных ініцыятыў з'яўляецца маладзёжны парламент.

— Мы хацелі б, каб у рамках форуму маладзёжнымі парламентамі нашых краін была праведзеная сур'ёзная работа. У маладых людзей шмат цікавых ініцыятыў, — дадаў Юрый Вараб'ёў.

sovrep.gov.by

Ён адзначыў, што ў цэлым большасць мерапрыемстваў форуму знаходзіцца ў высокай ступені гатоўнасці.

— Засталіся дробныя пытанні, якія трэба дапрацаваць. Сёння мы дамовіліся, хто і ў якія тэрміны будзе іх вырашаць, — паведаміў ён.

У сваю чаргу, Мар'яна Шчоткіна дадала, што напярэдадні форуму (4—5 ліпеня) у Беларусі пройдзе навукова-практычная канферэнцыя па пытаннях супрацоўніцтва дзвюх краін у галіне транспарту і лагістыкі.

— Адносіны Беларусі і Расіі былі, ёсць і будуць ўсёабдымныя, стратэгічныя і сяброўскія. Калі ёсць нейкія пытанні, трэба пра іх казаць і шукаць выйсце. Форум рэгіёнаў — добрая пляцоўка для такога дыялогу, — рэзюмавала віцэ-спікер верхняй палаты беларускага парламента.

Дзеля пашырэння стасункаў

Намеснік старшыні Савета Рэспублікі, сустаршыня аргкамітэта па падрыхтоўцы і правядзенні Форуму рэгіёнаў Беларусі і Узбекістана Мар'яна Шчоткіна і старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, кіраўнік рабочай групы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з Парламентам Рэспублікі Узбекістан Сяргей Рахманаў прынялі ўдзел у чарговым пасяджэнні Сумеснай міжурадавай камісіі па двухбаковым супрацоўніцтве. Мерапрыемства прайшло пад кіраўніцтвам намесніка прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Уладзіміра Дворніка і намесніка прэм'ер-міністра Рэспублікі Узбекістан Элера Ганіева.

Па інфармацыі прэс-службы Савета Рэспублікі, Мар'яна Шчоткіна выступіла з прэзентацыяй і паведаміла прысутным, як ідзе падрыхтоўка да Форуму рэгіёнаў Беларусі і Узбекістана. Узбекскаму боку ўнесены прапановы па прыкладнай праграме мерапрыемстваў будучага форуму, праграмах тэматычных секцый, агучаны пытанні арганізацыйнага характару, якія патрабуюць вырашэння ў працэсе падрыхтоўкі і правядзення запланаванага мерапрыемства.

Акрамя таго, на пасяджэнні былі разгледжаны актуальныя пытанні двухбаковага супрацоўніцтва ў сферы сельскай гаспадаркі, прамысловай кааперацыі, адукацыі, культуры, транспарту, турызму, ход рэалізацыі мерапрыемстваў дарожнай карты па развіцці супрацоўніцтва паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Узбекістан, зацверджанай прэм'ер-міністрамі дзвюх краін у лістападзе мінулага года.

Прыярытэты супрацоўніцтва

Беларусь разлічвае на ўмацаванне двухбаковых адносін з Чэхіяй

СТАРШЫНЯ Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Міхаіл МЯСНІКОВІЧ правёў сустрэчу з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Чэшскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Томашам ПЯРНІЦКІМ.

Як паведамляе прэс-служба Савета Рэспублікі, бакі абмеркавалі пытанні гандлёва-эканамічнага, інвестыцыйнага і гуманітарнага супрацоўніцтва.

У нашых краін шмат сфер, якія ўяўляюць узаемную цікавасць, падкрэсліў спікер верхняй палаты беларускага парламента. На яго думку, ёсць патэнцыял для больш дынамічнага развіцця гандлёва-эканамічных адносін, стварэння сумесных кампаній.

Фота БелТА.

— У нас можа быць больш сумесных праектаў. Кампаніі Чэхіі маглі б больш актыўна працаваць на беларускім рынку, праз Беларусь выходзіць са сваёй прадукцыяй на рынкі Еўразійскай эканамічнай прасторы, — адзначыў старшыня Савета Рэспублікі.

У ліку прыярытэтных кірункаў двухбаковага партнёрства ён назваў машынабудаванне.

— У гэтай частцы нам цікавы вопыт Чэхіі ў галіне рухавікоў, сістэм кіравання, — удакладніў Міхаіл Мясніковіч. — Мы можам рэалізаваць сапраўды добрыя праекты.

Акрамя таго, Беларусь і Чэхія маглі б паспяхова супрацоўнічаць у сферы фармацэўтыкі, палімерных матэрыялаў.

У сваю чаргу, дыпламат адзначыў цікавасць чэшскага бізнесу да нашай краіны. Ён расказаў пра найбольш паспяховыя сумесныя праекты, у тым ліку ў галіне сельскай гаспадаркі і водаачысткі.

Томаш Пярніцкі таксама акцэнтаваў увагу на тым, што ў другой палове 2022 года Чэхія прыме старшынства ў ЕС.

— Палітыка «Усходняга партнёрства» будзе адным з прыярытэтаў нашага старшынства, — падкрэсліў ён.

На перагаворах бакі таксама абмеркавалі магчымасці ўмацавання міжпарламенцкага супрацоўніцтва.

«У СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ ВАЖНА ПРАЦАВАЦЬ ТВОРЧА»

Падчас рабочай паездкі ў Баранавіцкі раён старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч наведаў шэраг сельгаспрадпрыемстваў розных формаў уласнасці

У АГРАКАМБІНАЦЕ «Мір», адной з найбуйнейшых гаспадарак Баранавіцкага раёна, нядаўна за кошт абласнога бюджэту і ўласных сродкаў распачалося будаўніцтва малочнатаварнай фермы на 765 галоў, таксама пабудаваны чатыры сянажныя і сіласныя траншэі. «Мір» — адметны вытворца прадукцыі жывёлагадоўлі не толькі ў раёне, але і ў вобласці. Гаспадарка зацікавіла ўпаўнаважанага Прэзідэнта па Брэсцкай вобласці яшчэ і тым, што нядаўна да яе было далучана вялікае стратнае прадпрыемства «Аграсэрвіс стандарт». Міхаіл Мясніковіч звярнуў увагу, што праблемную гаспадарку ў «Міры» дастаткова хутка адаптавалі да сваіх умоў, заработная плата тут наблізілася да сярэдніх 750 рублёў і праглядаюцца добрыя далейшыя перспектывы.

Дырэктар ААТ «Агракамбінат «Мір» Іван КЛІШЭВІЧ паведаміў, што праблемных момантаў пакуль вельмі і вельмі многа, але кіраўніцтва камбіната бачыць сваю задачу ў тым, каб захаваць і адзін, і другі калектыў, а таксама падтрымліваць неабходную дынаміку развіцця.

Адно з галоўных пытанняў, якое было ў полі зроку падчас рабочай паездкі, датычылася нарыхтоўкі травяных кармоў. На Брэстчыне сёлета плануецца нарыхтаваць іх у аб'ёме 1,7 мільёна тон. Такая лічба абумоўлена высокай шчыльнасцю буйной рагатай жывёлы: на 100 гектараў сельгасугоддзяў у рэгіёне прыпадае 73 галавы буйной рагатай жывёлы, у тым ліку 24 каровы, што амаль у 1,3 раза перавышае рэспубліканскія паказчыкі. На дзень, які папярэднічаў рабочай паездцы, у вобласці было нарыхтавана 23 працэнты ад плана травяных кармоў, што на ўмоўную галаву жывёлы складае 6,19 цэнтнера, а ў Баранавіцкім раёне названы паказчык наблізіўся да сямі цэнтнераў.

Гэты факт адзначыў старшыня Савета Рэспублікі, адказваючы на пытанні журналістаў, указаў на станоўчы вопыт мясцовых аграрыяў, якія ўцягваюць у гаспадарчы зварот так званыя няўдобіцы — поймы рэк, лугі, на якіх атрымліваюць кармы. 1100 гектараў такіх плошчаў выкарыстоўваюць сельгасвытворцы Баранавіцкага раёна менавіта для атрымання ўкосу траў.

Яшчэ адным цікавым аб'ектам для наведвання стала **фермерская гаспадарка «Фартуна» Галіны і Сяргея МАТУСАЎ.** Варта адзначыць, што яна складаецца з дзвюх асобных гаспадарак, якімі кіруюць муж і жонка. Гэтыя фермеры вылучаюцца не толькі ў сваім раёне, але і ў вобласці. Дастаткова сказаць, што сёлета Галіна Аркадзьеўна — дарэчы, другі раз за дзесяцігоддзе — стала чалавекам года ў Брэсцкай вобласці. Кіраўніка Савета Рэспублікі ў гэтым паспяховым прадпрыемстве цікавіла ўсё, асабліва калі ўлічыць, што жанчына — выпускніца гістфака БДУ. У «Фартуне» выкарыстоўваюцца самыя перадавыя айчынныя і замежныя тэхналогіі, Матусы пастаянна супрацоўнічаюць з навуковымі інстытутамі, ставяць на сваіх палях самыя смелыя эксперыменты.

Дык вось Галіна Матус рассказала, што работа на зямлі — самая творчая і цікавая. На думку Міхаіла Уладзіміравіча, у гэтым выказванні закладзена формула поспеху.

На гаспадарчым двары фермераў гаворка зайшла пра экалагічную прадукцыю, альбо арганічнае земляробства, пра якое апошнім часам шмат гаворыцца. На думку Галіны Матус, экалагічная прадукцыя — задача фермерскіх гаспадарак, вялікія аграхолдынгі гэтым займацца не будуць, таму што справа надзвычай працаёмістая і затратная. Тут патрэбныя адмысловыя тэхніка і тэхналогіі. Перш чым распачаць справу, Матусы аб'ехалі калег з Германіі, Данії, паглядзелі, на якіх машынах і якім чынам тыя працуюць. Там, напрыклад, ёсць машыны, што змагаюцца з лішняй расліннасцю з дапамогай гарачай пары, выпарваюць зелле. Фермеры прапануюць на ўзроўні краіны разгледзець пытанне, каб тым, хто займаецца экалагічным земляробствам, можна было завозіць спецыяльную тэхніку без аплаты ПДВ і мытных пошлін. Міхаіл Мясніковіч узяў на заметку ідэі фермераў, якія поўным ходам вядуць падрыхтоўку да арганічнага земляробства і займаюцца сертыфікацыяй 200 гектараў зямлі паводле ўсіх міжнародных стандартаў. Такую сертыфікацыю на іх полі прайшло ўжо 67 гектараў. У 2020 годзе Матусы спадзяюцца вырасціць першыя тоны арганічнай прадукцыі, якую ўжо сёння гатовыя забраць замежныя партнёры.

Адрасам наведвання стала таксама лыжароллерная траса ў аграгарадку Мір. Тут паводле даручэння Прэзідэнта зусім нядаўна абсталявана новае прафесійнае біятлоннае стрэльбішча. Траса цяпер функцыянуе ў поўным аб'ёме, ідуць трэніроўкі. Зараз тут праходзіць дзіцячы спартыўны лагер. На трасе штодзень трэніруюцца самыя юныя спартсмены дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы Баранавіцкага раёна, якія толькі скончылі першы клас. Паводле слоў **дырэктара школы Ларысы ЖАЛЕЗНАЙ,** усе цяперашнія выхаванцы школы ганарацца, што на II Еўрапейскіх гульнях у Мінску выступае яе выпускнік, спартсмен па спартыўнай хадзе Мікіта Каляда. А цяпер ва ўсіх дзяцей раёна з'явілася магчымасць займацца біятлонам.

Вынікі паездкі па Баранавіцкім раёне былі падведзеныя на пасяджэнні раённага выканаўчага камітэта. Было разгледжана пытанне гатоўнасці сельгасарганізацый да правядзення ўборкі ўраджаю, а таксама абмеркаваны бізнес-планы развіцця сельгасарганізацый у рамках выканання даручэнняў Прэзідэнта краіны.

Падчас паездкі Міхаіл Мясніковіч аддаў вялікую ўвагу агляду комплекснага выканання плана ўстойлівага развіцця Баранавічаў. Нарада па гэтым пытанні прайшла ў гарвыканкаме. Абмеркавалі прывядзенне ў парадак мясцовых дарог. У горадзе трэба добраўпарадкаваць 150 кіламетраў вуліц толькі ў прыватным сектары. З іх 50 кіламетраў будзе прыведзена ў парадак ужо сёлета.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

АКТУАЛЬНАЕ ІНТЭРВ'Ю

РУХ НАСУСТРАЧ

Беларусь і Егіпет маюць намер прадоўжыць курс на ўмацаванне двухбаковага супрацоўніцтва

На гэтым тыдні Мінск з афіцыйным візітам наведаў Прэзідэнт Егіпта Абдэль Фатах ас-Сісі. Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Міхаіл МЯСНІКОВІЧ прыняў удзел у сустрэчы з высокім госцем, якая прайшла ў Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу.



Фота БелТА.

Як паведамляе прэс-служба верхняй палаты парламента, падчас перагавораў Міхаіл Мясніковіч прапанаваў надаць дынаміку супрацоўніцтву дзвюх краін у галіне навукі і тэхналогій.

— Мы маглі б больш актыўна працаваць у пытаннях трансферу ведаў і вопыту Беларусі ў медыцыне, інжынернай сферы, інфармацыйных тэхналогіях і многіх іншых кірунках, — адзначыў ён.

Акрамя таго, старшыня Савета Рэспублікі акцэнтаваў увагу на магчымасцях прыцягнення моладзі Егіпта для атрымання адукацыі ў беларускіх ВНУ. Краіны таксама могуць больш актыўна развіваць дзелавыя стасункі і ствараць сумесныя кампаніі, упэўнены спікер верхняй палаты беларускага парламента.

На перагаворах абмяркоўваліся перспектывы двухбаковага супрацоўніцтва ў сферы турызму і культуры.

* * *

Аб сферах узаемадзеяння, якія ўяўляюць узаемную цікавасць, і ролі міжпарламенцкага партнёрства ва ўмацаванні адносін паміж краінамі напярэдадні яго візіту ў інтэрв'ю газеце Akbar Al-Youm расказаў старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Міхаіл Мясніковіч.

Егіпет з'яўляецца важным і надзейным палітычным партнёрам Беларусі на Блізкім Усходзе і афрыканскім кантыненце. У апошнія гады палітычны дыялог паміж нашымі краінамі прыкметна актывізаваўся. У яго аснове — адкрытыя і дружалюбныя адносіны паміж кіраўнікамі дзяржаў.

Візіт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі ў Егіпет, які адбыўся ў студзені 2017 года, з'яўляецца добрым пацвярджэннем імкнення Беларусі павышаць узровень двухбаковых сувязяў з Егіптам. Па выніках перагавораў, якія прайшлі тады ў Каіры, вызначаны найбольш перспектыўныя кірункі ўзаемадзеяння нашых дзяржаў. Распрацавана і рэалізавана дарожная карта па развіцці супрацоўніцтва на 2017—2018 гады. Створаны міжпарламенцкія групы дружбы. Дасягнуты дамоўленасці аб новых сумесных праектах — у прамысловасці, сельскай гаспадарцы, дрэваапрацоўцы, навуцы і адукацыі.

У лютым 2018 года ў Егіпце адкрылі зборачную вытворчасць грузавых аўтамабіляў МАЗ. Упершыню пачалася пастаўка на егіпецкі рынак камунальнай і дарожнай тэхнікі кампаніі «Амкадор». Рэалізаваны кантракты па зборцы сельскагаспадарчых машын «Бабруйскаграмаш». Паспяхова працуе зборачная вытворчасць Мінскага трактарнага завода. Гэта далёка не поўны пералік праектаў. У цяперашні час беларускімі кампаніямі прапрацоўваецца стварэнне ў Егіпце вытворчасцяў збожжаўборачных камбайнаў, рухавікоў, кампрэсараў, электробусаў. Гэта добрыя прыклады ўзаемавыгаднага партнёрства, і іх, мяркую, будзе больш. Асаблівасць супрацоўніцтва ў прамысловай сферы ў тым, што беларускія і егіпецкія кампаніі ствараюць вытворчыя магутнасці ў Егіпце, а значыць, новыя працоўныя месцы для грамадзян гэтай краіны.

Ад простага гандлю пераходзім да новых формаў партнёрства, гэта значыць прамысловай кааперацыі, інвестыцыйнага супрацоўніцтва, стварэння сумесных кампаній і вытворчасцяў. Усё гэта ў канчатковым выніку працуе на ўмацаванне нацыянальных эканомік, павышэнне якасці жыцця нашых народаў.

Якім чынам надаць дынаміку двухбаковаму супрацоўніцтву і павысіць яго выніковасць, мы абмяркоўвалі на сустрэчы са старшынёй Палаты прадстаўнікоў Егіпта Яго Правасхадзіцельствам Алі Абдэль Аль Саедам у Мінску ў лістападзе 2018 года. Тады было падпісана пагадненне аб міжпарламенцкім супрацоўніцтве, якое ўмацоўвае двухбаковыя сувязі. Для гэтага ў нашых краін ёсць неабходны патэнцыял.

Аб'ём узаемнага гандлю па выніках 2018 года вырас на 11 % у параўнанні з 2017-м і склаў 108 мільёнаў долараў ЗША. Станоўчая дынаміка захоўваецца і сёлета. Аднак гэта далёка не мяжа, і лічбы могуць быць большыя.

Беларусь падтрымлівае намеры па заключэнні пагаднення аб зоне свабоднага гандлю паміж краінамі Еўразійскага эканамічнага саюза і Егіптам. Дакумент будзе спрыяць зняццю многіх бар'ераў, якія ўсё яшчэ прысутнічаюць, у тым ліку ў нашым двухбаковым гандлі.

Еўразійская эканамічная прастора — гэта вялікі рынак памерам 170 мільёнаў чалавек. Акрамя таго, Беларусь можа стаць для Егіпта сувязным звяном з краінамі Заходняй Еўропы. Асаблівае значэнне ў гэтым кантэксце набываюць сумесныя праекты ў галіне транспарту і лагістыкі. Наколькі нам вядома, Егіпет з'яўляецца актыўным удзельнікам глабальнай ініцыятывы «Адзін пояс, адзін шлях». Беларусь таксама імкнецца ўдзельнічаць у буйных інфраструктурных праектах Вялікага Шаўковага шляху. Камфортныя ўмовы для кампаній створаны ў Кітайска-беларускім індустрыяльным парку «Вялікі камень», інфраструктурных праектах і гандлёва-лагістычных хабах.

Добрыя перспектывы мае супрацоўніцтва нашых краін у навукова-тэхнічнай і адукацыйнай сферах. Зачын ужо створаны. Вучоныя Беларусі і Егіпта паспяхова рэалізуюць сумесныя навукова-даследчыя праекты ў галіне нанаматэрыялаў, малекулярнай генетыкі, металазнаўства. Што да адукацыі, то ў 2019 годзе Беларусь упершыню выдзеліла адукацыйныя гранты для атрымання грамадзянамі Егіпта ступеняў бакалаўра і магістра ў ВНУ. Выкладчыкі і студэнты Беларусі бяруць удзел у курсах арабскай мовы, арганізаваных Каірскім універсітэтам.

Яшчэ адзін перспектыўны кірунак партнёрства — турызм. Егіпет застаецца адной з найбольш папулярных краін для турыстаў з Беларусі. У 2017 годзе Егіпет наведалі 123 тысячы беларусаў, у 2018-м — 212 тысяч. Колькасць егіпецкіх турыстаў, якія прыязджаюць на адпачынак у Беларусь, пакуль нязначная. Але мы зацікаўлены ў тым, каб іх было больш. Беларусь — зялёная краіна, тут унікальная, шмат у чым першародная прырода. Яна прыцягвае турыстаў з усяго свету. У нас шмат цікавых гістарычных месцаў, помнікаў архітэктуры, музеяў.

> Актывізацыя палітычных і гандлёва-эканамічных кантактаў паміж нашымі краінамі абумоўлена ў першую чаргу ўзаемным даверам, агульнасцю прынцыпаў унутранай і знешняй палітыкі, супадзеннем поглядаў на найважнейшыя праблемы сусветнага парадку дня.

— Якія перспектывы супрацоўніцтва паміж парламентамі Беларусі і Егіпта? Наколькі ўзгоднены пазіцыі дзвюх краін на міжнародных форумах у святле відавочнага збліжэння пазіцый па многіх пытаннях?

— Нашы краіны аказваюць узаемную падтрымку адна адной у міжнародных арганізацыях. Напрыклад, у ААН вялася сумесная работа над прасоўваннем ініцыятыў па супрацьдзеянні гандлю людзьмі і абароне сямейных каштоўнасцяў. Егіпет падзяляе падыходы Беларусі ў дачыненні да недапушчальнасці палітызацыі тэматыкі правоў чалавека, непрымальнасці краінавых рэзалюцый.

Дагаворна-прававой базы. Сёння яе фарміруюць 45 дакументаў. Мы ўдзячныя егіпецкім калегам за актывізацыю работы па падрыхтоўцы двухбаковых пагадненняў аб супрацоўніцтве ў галіне маладзёжнай палітыкі, антыманапольнага рэгулявання і міжбанкаўскага ўзаемадзеяння. Дынаміка перагавораў па гэтых і іншых дакументах падкрэслівае ўзаемную зацікаўленасць ва ўмацаванні адносін.

Для нас важна, каб палітычны дыялог працягваў трансфармавацца ў канкрэтныя двухбаковыя праекты ў эканамічнай, навукова-тэхнічнай і адукацыйнай сферах. Мы гатовы перадаваць калегам на ўзаемавыгадных умовах новыя веды, ноу-хау, тэхналогіі. Нашы навукоўцы, інжынеры валодаюць неабходнай кампетэнцыяй.

> Аб'ём узаемнага гандлю па выніках 2018 года вырас на 11 % у параўнанні з 2017-м і склаў 108 мільёнаў долараў ЗША. Станоўчая дынаміка захоўваецца і сёлета. Аднак гэта далёка не мяжа, і лічбы могуць быць большыя.

— Міхаіл Уладзіміравіч, як вы ацэньваеце магчымасці ўмацавання супрацоўніцтва Беларусі і Егіпта з улікам цяперашняга візіту?

— Візіт Яго Правасхадзіцельства Прэзідэнта Егіпта Абдэль Фатаха ас-Сісі стане першым афіцыйным візітам у Беларусь у гісторыі беларуска-егіпецкіх адносін. У гэтым яго пэўная знакавасць. Мы звязваем з візітам вялікія чаканні па ўмацаванні і пашырэнні двухбаковага супрацоўніцтва і разлічваем, што ён адкрые новую старонку ў нашых адносінах.

Міжпарламенцкае супрацоўніцтва з'яўляецца важным складнікам палітычнага дыялогу. Беларусь высока ацэньвае вынікі афіцыйнага візіту старшыні Палаты прадстаўнікоў Егіпта Яго Правасхадзіцельства Алі Абдэль Аль Саеда ў Мінск у 2018 годзе, які стаў важным крокам на шляху ўмацавання міжпарламенцкіх сувязяў.

Актывізацыя палітычных і гандлёва-эканамічных кантактаў паміж нашымі краінамі абумоўлена ў першую чаргу ўзаемным даверам, агульнасцю прынцыпаў унутранай і знешняй палітыкі, супадзеннем поглядаў на найважнейшыя праблемы сусветнага парадку дня.

Сучасны Егіпет развіваецца з апорай на свае ўласныя сілы і сілы надзейных краін-партнёраў. У іх ліку — Беларусь. Наша краіна таксама зацікаўлена ў далейшым развіцці дружалюбных адносін з Егіптам.

Савет Рэспублікі і парламент Беларусі ў цэлым будуць усяляк гэтаму садзейнічаць. Значная роля ў гэтай рабоце адводзіцца міжпарламенцкім групам дружбы. Важна максімальна задзейнічаць іх патэнцыял для прасоўвання двухбаковага супрацоўніцтва ў гандлёва-эканамічнай, адукацыйнай і навукова-тэхнічнай сферах. Цяпер мы над гэтым працуем.

Асаблівую ўвагу варта ўдзяліць удасканальванню

— Як вы ставіцеся да праблемы тэрарызму і экстрэмізму на рэгіянальным і міжнародным узроўнях і якія шляхі яе вырашэння? Наколькі важны для міжнароднай супольнасці вопыт Егіпта?

— Распаўсюджванне тэрарызму і ісламскага радыкалізму з'яўляецца сёння адным з найбольш вострых пытанняў на Блізкім Усходзе. Беларусь рашуча асуджае тэрарызм у любых формах і праявах, выказвае падтрымку намаганням міжнароднай супольнасці ў барацьбе з тэрарызмам і экстрэмізмам.

Беларускі бок лічыць, што акты гвалту ў дачыненні да грамадзянскага насельніцтва, якія пачасціліся апошнім часам, не маюць апраўдання і не павінны заставацца без жорсткай кансалідаванай рэакцыі сусветнай супольнасці.

Вопыт барацьбы з тэрарызмам, якім валодае Егіпет, па праве лічыцца адным з паспяховых на Блізкім Усходзе. Вашай краіне ўдалося выпрацаваць эфектыўную мадэль процідзеяння радыкальным сілам праз татальную барацьбу, якая праводзіцца па многіх кірунках. Егіпет робіць істотны ўнёсак у вырашэнне рэгіянальных праблем у сферы бяспекі. Тут у нас шмат агульнага — Беларусь таксама адданая прынцыпам умацавання ўсеагульнага міру і бяспекі.

УЗАЕМАДЗЕЯННЕ ВЫРАШАЕ ЎСЁ

На кантролі ў старшыні Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярыны ЗЕНКЕВІЧ цэлае кола пытанняў — ад рэалізацыі дзяржаўных праграм да пэўных праблем асобных грамадзян. І ўсё ж найбольш актуальным сёння яна лічыць садзейнічанне занятасці насельніцтва і забеспячэнне дастойнага ўзроўню жыцця:

— Цяпер у вобласці дзейнічае 25 пастаянных камісій па садзейнічанні занятасці насельніцтва. Старшыні раённых Саветаў дэпутатаў, якія іх узначальваюць, у даступнай форме расказваюць пра існуючыя магчымасці. У тым ліку пра ажыццяўленне прадпрымальніцкай дзейнасці без неабходнасці рэгістравацца ў якасці суб'екта прадпрымальніцтва, атрыманне субсідый, аказанне паслуг у сферы аграэкатурызму, пра спецыяльныя рэжымы падаткаабкладання. Такая сістэмная работа дазволіла зменшыць каэфіцыент напружанасці на рынку працы ў параўнанні з аналагічным леташнім перыядам з 0,4 да 0,2. Сёлета ў студзені — красавіку працаўладкавана 7640 грамадзян, з іх беспрацоўных — 4593. Важна не толькі забяспечыць работай, а даць магчымасць самарэалізавацца. Таму мы надаём вялікую ўвагу развіццю прыватнага бізнесу, самазанятасці людзей. На пачатак мая на Гомельшчыне зарэгістравана амаль 38 тысяч суб'ектаў прадпрымальніцтва. Гэтая лічба павялічваецца. Роля дэпутацкага корпуса тут вялікая. Мы актыўна ўзаемадзейнічаем і з дзяржаўнымі органамі кіравання, і з прыватным бізнесам. Рэгулярна праводзім выязныя сустрэчы ў рэгіёнах, дзе комплексна і кропкава вырашаем цэлае кола пытанняў.

— Кацярына Анатольеўна, разам з вамі і мне давялося быць удзельніцай такіх сустрэч-семінараў. Калі падагульняць іх дзейнасць, якія важныя праблемы атрымалася вырашыць?

— Сёлета за пяць месяцаў мы вывучылі досвед работы ў пяці раёнах, а запланавана наведаць яшчэ сем. Нашы сустрэчы раскрываюць унікальнасць кожнага рэгіёна. У семінарах бяруць удзел прадстаўнікі органаў кіравання, прадпрыемстваў і арганізацый, якія адначасова з'яўляюцца дэпутатамі Саветаў рознага ўзроўню. Падчас сустрэч мы наведваем да пяці сельсаветаў. У кожным — некалькі населеных пунктаў. Абавязкова сустракаемся з насельніцтвам, працоўнымі калектывамі, аглядаем аб'екты сацкультбыту. Напрыклад, Гомель падзяліўся ўнікальнымі напрацоўкамі сістэмнага ўзаемадзеяння органаў мясцовага кіравання і самакіравання з насельніцтвам праз калегіяльны орган тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання (КОТГС). Калі ў вёсцы ёсць старэйшына, стараста, памочнік старшыні Савета, то ў горадзе гэтая дзейнасць мае спецыфіку. На тэрыторыі Буда-Кашалёўскага раёна быў вывучаны досвед рэгіёна па аднаўленні, захаванні і развіцці традыцыйных культур і рамёстваў. Брагінскі раён падзяліўся сваімі ўнікальнымі мясцовымі ініцыятывамі, якія рэалізуюцца ва ўзаемадзеянні з міжнароднымі арганізацыямі. Раён пацярпеў ад чарнобыльскай катастрофы, тым не менш ён працягвае жыць і развівацца. У выніку рэалізацыі мясцовых ініцыятыў там вырошчваюць экалагічна чыстую сельскагаспадарчую прадукцыю па новых інавацыйных методыках.

> Летась і сёлета мы паўсюдна праводзілі суботнікі. Такім чынам прыведзены ў парадак месцы масавага адпачынку, помнікі, паркі, скверы, дзіцячыя пляцоўкі, пасаджаны тысячы дрэў. Чалавек, які сам паставіў плот ці пасадзіў дрэва, ніколі не зломіць яго. І іншым не дасць гэта зрабіць.

— Дарэчы, мы падрабязна пісалі аб гэтым у «Мясцовым самакіраванні»...

— Іншыя мясцовыя Саветы таксама актыўна працуюць з праектамі Еўрасаюза і праграмамі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па садзейнічанні развіццю на мясцовым узроўні. Агульны бюджэт для рэалізацыі мясцовых ініцыятыў у 2018 годзе склаў амаль 500 тысяч долараў і каля 800 тысяч еўра. У Гомельскай вобласці дзякуючы мясцовым ініцыятывам абнаўляецца абсталяванне, добраўпарадкоўваюцца тэрыторыі, укараняюцца прынцыпы здаровага ладу жыцця. Напрыклад, у Лоеўскім раёне пачаў працаваць сямейны клуб «Нашчадкі Лоя»; «Музей хлеба» і «Цэнтр ткацтва» — у Чачэрскім раёне; ініцыятыва «Дзейнічаем разам» у доме састарэлых Веткаўскага раёна і іншыя. Ініцыятарам і каардынатарам звычайна выступае абласны Савет дэпутатаў.

— Навядзенне парадку на зямлі — адна з пастаянных задач, што дэпутаты мясцовых Саветаў робяць для развіцця сваіх тэрыторый?

— На сённяшні дзень мы вывучылі стан спраў у кожным раёне, прыцягнулі прадстаўнікоў камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, санстанцыі, ЖКГ, землеўпарадкавальную службу, МНС, УУС і іншых. У выніку вырашылі дзве, на мой погляд, глабальныя задачы. Першая — гэтыя службы былі кантралёрамі над старшынёй сельсавета, а цяпер сталі партнёрамі па агульнай справе — стварэнні годных умоў жыцця. Другая — насельніцтва стала браць актыўна ўдзел у грамадскім жыцці свайго рэгіёна. Прычым не толькі ў добраўпарадкаванні, самафінансаванні, але таксама ў спартыўным і культурным жыцці. Я неаднаразова ўдзельнічала ў мясцовых суботніках і бачыла, як шчыра людзі адгукаюцца на любую ініцыятыву, у тым ліку на сумесную працу. Быў нават кур'ёзны выпадак. Мясцовы блогер у адным з раёнаў прыйшоў на суботнік з відэаапаратурай. Ён пачаў, мякка кажучы, пакеплiваць з землякоў, якія працавалі. У выніку ўзяў граблі і пайшоў прыбіраць скошаную траву. Гэта вельмі паказальны прыклад сумеснай работы дэпутатаў і мясцовага насельніцтва. Летась і сёлета мы паўсюдна праводзілі суботнікі. Такім чынам прыведзены ў парадак месцы масавага адпачынку, помнікі, паркі, скверы, дзіцячыя пляцоўкі, пасаджаны тысячы дрэў. Чалавек, які сам паставіў плот ці пасадзіў дрэва, ніколі не зломіць яго. І іншым не дасць гэта зрабіць.

Гомельскім абласным Саветам дэпутатаў прыняты 16 рэгіянальных комплексаў мерапрыемстваў па рэалізацыі дзяржаўных праграм: «Малое і сярэдняе прадпрымальніцтва», «Сацыяльная абарона і садзейнічанне занятасці», «Адукацыя і маладзёжная палітыка», «Культура Беларусі», «Пераадоленне наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС на 2011—2015 гады і на перыяд да 2020 года», «Ахова навакольнага асяроддзя і ўстойлівае выкарыстанне прыродных рэсурсаў», «Развіццё аграрнага бізнесу» і іншыя.

— Якім чынам заахвочваюцца актыўныя дэпутаты і іх ініцыятывы?

— З мэтай павышэння ролі органаў мясцовага самакіравання, зацікаўленасці мясцовага насельніцтва арганізавана работа па правядзенні штогадовага конкурсу сярод гарадскіх, пасялковых, сельскіх Саветаў дэпутатаў, органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання. У абласным бюджэце штогод прадугледжваюцца сродкі на заахвочванне пераможцаў. Сумы для бюджэтаў Саветаў вельмі значныя: ад 10 да 1500 базавых велічынь. Вынікі конкурсаў падводзяцца штогод да 1 мая. Аналагічныя конкурсы арганізуюцца і ў раёнах. Прызавы фонд накіроўваецца на добраўпарадкаванне тэрыторый, умацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы Саветаў. Сёлета, напрыклад, у групе з колькасцю насельніцтва ад 1100 да 1500 чалавек перамог Скрыгалаўскі сельскі Савет Мазырскага раёна. Частку сродкаў там накіравалі на ўстанаўленне агароджы ў вёсцы Лешня. Сюды на маляўнічае возера часта прыязджаюць госці Гомельшчыны. Таму ахайны знешні выгляд населенага пункта — яго важная характарыстыка.

— Кацярына Анатольеўна, абласны Савет практыкуе разнастайныя формы стасункаў з насельніцтвам. Якія з іх найбольш прадуктыўныя?

— Насамрэч іх шмат, бо мы павінны ведаць пра ўсе жыццёвыя праблемы, якія трэба вырашаць першачаргова. Нашы кіраўнікі сельсаветаў праводзяць сходы па месцы жыхарства, сустрэчы ў працоўных калектывах, выязныя сумесныя прыёмы грамадзян... Дарэчы, работа са зваротамі — адна з самых важных формаў дзейнасці. Дадаткова ўведзена практыка прыёму пасля сустрэч у працоўных калектывах. Дэпутатамі абласнога Савета за пяць месяцаў года праведзена каля 350 сустрэч з працоўнымі калектывамі і на месцах у выбарчых акругах і столькі ж асабістых прыёмаў грамадзян, разгледжана каля 500 зваротаў. Я сустракалася з працоўнымі калектывамі ААТ «Камінтэрн», ДЛГУ «Гомельскі доследны лясгас», Хойніцкага дзяржаўнага прафесійнага ліцэя. Хутка пройдзе сустрэча ў Рагачове. Непасрэдна ў абласны Савет паступіла 20 асабістых зваротаў і 58 — на прамую тэлефонную лінію. Усе пытанні да поўнага іх вырашэння застаюцца на кантролі. З асабістага досведу магу сказаць, што работа дае эфект. Людзі ведаюць пра магчымасці дэпутата і таму даволі часта звяртаюцца да яго па дапамогу ці кансультацыю. Як старшыня абласнога Савета дэпутатаў я вяду прыём грамадзян кожны другі аўторак месяца, як дэпутат ад Бярэзінскай выбарчай акругі № 55 — кожны трэці чацвер. Адзначу: самая вялікая колькасць пытанняў датычыцца жыллёва-камунальнай гаспадаркі, працаўладкавання, гандлёвага і бытавога абслугоўвання, падтрымкі асабістых дапаможных гаспадарак, добраўпарадкавання...

— Ці часта да вас звяртаюцца людзі, якім патрэбна асаблівая ўвага, напрыклад састарэлыя?

— Клопат пра людзей паважнага ўзросту — гэта асабліва важная тэма. Пажылыя грамадзяне звяртаюцца з просьбай штосьці адрамантаваць, забяспечыць бясплатным сацыяльным абслугоўваннем. Пры гэтым часта ў іх ёсць працаздольныя і забяспечаныя дзеці. Нярэдка гэтага патрабуюць і самі дзеці. Задача дэпутата — даходліва растлумачыць, чым дзяржава можа дапамагчы, вырашэнне якіх пытанняў можа пачакаць, а што павінен рабіць сам грамадзянін. Асаблівая ўвага надаецца стварэнню бяспечных умоў жыцця. На Гомельшчыне створана 346 наглядальных камісій. Іх дзейнасць каардынуюць старшыні сельсаветаў. Члены камісій ведаюць усіх, хто схільны да рызыковых паводзін, хто вядзе асацыяльны лад жыцця, тых, хто знаходзіцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, у дачыненні да каго ёсць інфармацыя пра наяўнасць прычын і ўмоў, што ствараюць пагрозу жыццю і здароўю. Рэйды праходзяць пастаянна. За чатыры месяцы года абследавана 68 тысяч домаўладанняў. Устаноўлена 14 чалавек, якім патрабавалася аказанне экстраннай медыцынскай дапамогі. Ідзе кантроль за тым, як устараняюцца выяўленыя факты парушэнняў.

> У Гомельскай вобласці дзякуючы мясцовым ініцыятывам абнаўляецца абсталяванне, добраўпарадкоўваюцца тэрыторыі, укараняюцца прынцыпы здаровага ладу жыцця.

— Раскажыце, калі ласка, пра тое, як дэпутаты мясцовых Саветаў прадстаўляюць Гомельшчыну на міжнароднай арэне.

— Летась мы сталі ўдзельнікамі пятага Форума рэгіёнаў Беларусі і Расіі ў Магілёве, першага Форума рэгіёнаў Беларусі і Украіны ў Гомелі, міжнароднай канферэнцыі ў Бранскай вобласці і іншых значных мерапрыемстваў. Сёлета ў ліпені ў Санкт-Пецярбургу адбудзецца шосты Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Другі Форум рэгіёнаў Беларусі і Украіны плануецца ў жніўні ў Жытоміры. Гомельскім абласным Саветам дэпутатаў падпісаны дагаворы з Амурскай, Бранскай, Курскай і Арэнбургскай абласцямі, заканадаўчымі сходамі Ніжагародскай і Кіраўскай абласцей, а таксама шэраг іншых інтэграцыйных дагавораў, якія павышаюць узровень міжрэгіянальных сувязяў. Адным з кірункаў работы з'яўляецца практычнае ўзаемадзеянне з калегамі ў краіне. Я лічу, што дэпутаты павінны галосна і адкрыта інфармаваць выбаршчыкаў аб сваёй працы, планах, часцей выступаць у прэсе, даносіць свой пункт гледжання, тлумачыць актуальныя пытанні, таму што недахоп інфармацыі спараджае неабгрунтаваныя чуткі. Хачу падзякаваць нашым выбаршчыкам за неабыякавасць, актыўную жыццёвую пазіцыю, давер і падтрымку. За работай дэпутата стаяць дабрабыт людзей, рашэнне іх надзённых праблем. Мы будзем і надалей актыўна працаваць над выкананнем усіх пастаўленых задач.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

АВЕН. На гэтым тыдні вы можаце стаць асабліва летуценныя. Усё б нічога, але мары будуць не самай практычнай уласцівасці, некаторыя наогул могуць стацца вельмі дзіўнымі. А ў найбліжэйшыя дні тое, пра што будзеце шмат думаць, можа якраз адбыцца. Так што не пашкодзіць некаторая асцярожнасць пры будаўніцтве паветраных замкаў. Падзеі канца тыдня могуць пазбавіць вас ад парачкі застарэлых комплексаў. Не выключаны любоўныя прыгоды. Але лепш не губляць галавы.

ЦЯЛЕЦ. На гэтым тыдні можаце праявіць небывалую актыўнасць. Адначасова ўзрастуць і вашы запыты, і патрабаванні ў адносінах да сябе, і прэтэнзіі да навакольных. У панядзелак найбольш паспяхова пойдуць справы, звязаныя з камерцыяй і продажамі. Серада можа стацца ўдалым днём для пераходу на новую работу. На пятніцу не варта планаваць нічога сур'ёзнага, вашы намеры наўрад ці ажыццявяцца ў тым выглядзе, у якім будуць задуманы. Нядзелю правядзіце у коле сям'і.

БЛІЗНЯТЫ. Выпадзе ўнікальны шанц ператварыць сапернікаў у саюзнікаў, але дзейнічаць неабходна асцярожна і дыпламатычна. У першай палове тыдня чакайце важных падзей і навін у асабістым жыцці. Магчыма ажыццяўленне даўніх планаў і ўвасабленне ў жыццё запаветнай мары. Вас акружаць любоўю і клопатам. Калі былі праблемы са здароўем, яны знікнуць, не пакінуўшы следу.



РАК. Можаце сутыкнуцца з акалічнасцю, якая зменіць ваша жыццё ў лепшы бок. Паспрабуйце займацца справамі, якія не прэтэндуюць на глабальнасць, але таксама важныя. Дзеці могуць запатрабаваць пільнай увагі. У чацвер праявіце грамотную карэктнасць пры зносінах з калегамі на рабоце. Выхадныя лепш правесці з даўнімі сябрамі і пагаварыць шчыра.



ЛЕЎ. На гэтым тыдні вы можаце праявіць сябе занадта эмацыянальным чалавекам і даставіць шмат клопатаў не толькі сабе, але і навакольным. Будзьце асцярожныя ў дачыненні да новых знаёмых, бо ёсць небяспека патрапіць «на кручок» да не вельмі прыстойных людзей. Не варта прымаць паспешлівых рашэнняў, лепш прыслухацца да інтуіцыі і не ісці супраць плыні. Перыяд удалы для пошукаў работы і наладжвання адносін. Калі збіраліся адправіцца ў адпачынак, цяпер самы час.

ДЗЕВА. Глядзіце наперад, думайце пра будучыню, не азірайцеся назад, інакш трапіце ў пастку ўспамінаў пра мінулыя памылкі. Неабходна знайсці залатую сярэдзіну паміж жаданнямі і рэальнасцю, і ў гэтым вам дапамогуць парады блізкіх людзей, якія на гэтым тыдні апынуцца нечакана мудрымі і своечасовымі. У аўторак будзьце асцярожныя ў выказваннях, старайцеся берагчы свае і чужыя сакрэты. У сераду ў вашых руках можа апынуцца стырно ўлады, але, атрымаўшы яго, не станавіцеся дыктатарам. У нядзелю не спакушайцеся, рызыкуеце стаць ахвярай памылкі або падману.

ШАЛІ. Зможаце яркі і арыгінальна праявіць сябе, станоўча зарэкамендаваць у калектыве. Але пры гэтым улічвайце і інтарэсы іншых людзей. У гэты перыяд нават любая дробязь можа апынуцца істотнай для вас. Да пачатку адпачынку трэба вырашыць назапашаныя праблемы. У сераду паспрабуйце пазбегнуць паспешных і неабдуманых рашэнняў як у дзелавых пытаннях, так і ў праблемах асабістага характару. У суботу праявіце пэўную паблажлівасць да дзяцей, з першага разу вам наўрад ці ўдасца дамагчыся іх разумення.

СКАРПІЁН. На гэтым тыдні на стаўленне да службовых і прафесійных пытанняў станоўчы ўплыў акажа прага разнастайнасці і навізны. Аднак давядзецца прыкласці некаторыя намаганні, каб засяродзіцца на канкрэтнай справе і атрымаць салідны прыбытак. Грошай стане больш, што дазволіць зрабіць дарагі падарунак каханаму чалавеку. У пятніцу магчыма неспадзяваная змена планаў, якая паверне жыццё ў лепшы бок.



СТРАЛЕЦ. Не спрабуйце вырашаць праблемы з дапамогай сілы і прамых канфліктаў. Успрымальнасць і гнуткасць дазволяць набыць у асобе партнёраў сапраўдных аднадумцаў. У сярэдзіне тыдня можаце апынуцца перад неабходнасцю зрабіць выбар, дзейнічайце спакойна, абдумана і без паспеху. Нікому не дазваляйце ўстаўляць вам палкі ў колы і паніжаць самаацэнку. У суботу можаце вельмі эмацыянальна адрэагаваць на падзеі, што адбываюцца, таму варта паклапаціцца пра тое, каб дзень прайшоў лёгка і прыемна. Выбірайцеся на прыроду і правядзіце час у кампаніі сяброў, зладце свята, і не думайце аб праблемах.

КАЗЯРОГ. Тыдзень чакаецца надзвычай плённы, насычаны разнастайнымі падзеямі. Заплануйце на гэты час важныя сустрэчы і перамовы, але не займайце справамі ў панядзелак і чацвер. Чым больш актыўнымі, больш рухомымі і больш гнуткімі вы апыняцеся, тым больш правільных рашэнняў здолееце адшукаць і тым большаму здолееце навучыцца. Сябры і блізкія выявяцца дрэннымі дарадцамі, спадзявайцеся толькі на сябе. Часткай работы можаце падзяліцца з калегамі, яны не пакрыўдзяцца. Старайцеся не ўпарціцца толькі з-за страху перамен.



ВАДАЛІЎ. Начальнікам прыйшоў час заняцца кадрамі. Калі ж у вас у падпарадкаванні толькі хатнія, давядзецца абмежавацца іх выхаваннем. У тым жа выпадку, калі няма зусім нікога, не застаецца нічога, акрамя як самаўдасканальвацца. Толькі, перш чым пачынаць дзейнічаць, варта прадумаць усё да дробязяў. Самы час заняцца вывучэннем новых тэхналогій і моў. У выхадныя варта аддаць перавагу адзіноце і добрай кнізе, а не шумнай кампаніі і пустым размовам.



РЫБЫ. Не дазваляйце спакусе збіваць вас са шляху праўдзівага, ад добрага лепшага не шукаюць. Вы можаце стаць аб'ектам інтрыгі. Ёсць небяспека паўтарыць свае памылкі ў асабістым жыцці толькі таму, што вам зручней хадзіць па пратаптанай сцежцы. Лепш спытайце парады ў надзейных сяброў або ў сваякоў, якім даверяеце. У другой палове тыдня з'явіцца магчымасць для самарэалізацыі ў творчасці. Дзецям спатрэбіцца падтрымка.

Сядзі і глядзі

Ты помніш, як усё пачыналася?

15 гадоў таму на экраны выйшла оскараносная рамантычна-фантастычная драма «Вечнае ззянне чыстага розуму». Фільм сцэнарыста Чарлі Каўфмана і рэжысёра Мішэля Гондры атрымаў некалькі дзясяткаў прэстыжных кінаўзнагарод — ад «Оскара» за найлепшы сцэнарый да прэмій BAFTA і Брэма Стокера, сабраў у сусветным пракаце больш за 72 мільёны долараў (пры бюджэце 30 мільёнаў) і заняў трывалае месца ў сэрцах многіх кінаманаў — а ў 2015 годзе яго аднавілі ўжо ў выглядзе тэатральнай пастаноўкі ў Паўднёвай Карэі.

Фота kinopoisk.ru.

Паводле сюжэта гэтай гісторыі, экстравагантная і жыццярадасная дзяўчына Клементіна (Кейт Уінслет) і самотны меланхолік Джоэл (Джым Керы — дарэчы, гэта адна з нямногіх яго некамедыйных роляў) выпадкова сустрэліся ў цягніку і пакахалі адно аднаго. Але з часам праблем, напружання і незадаволенасці адно адным у стасунках стала настолькі многа, што маладыя людзі паскандалілі і рассталіся. А калі Джоэл вырашыў памірыцца і зайшоў да дзяўчыны на работу, тая... не пазнала яго. Як высветлілася, Клементіна з дапамогай нейкай фірмы сцерла ўсе ўспаміны пра каханага. Каб выкінуць яе з сэрца, Джоэл вырашае зрабіць тое ж самае — аднак падсвядомасць катэгарычна супраць тэхналагічнага ўмяшання, таму дарагія моманты адсоўваюцца ў самыя патаемныя куткі памяці ажно да дзяцінства, адкуль іх немагчыма выдаліць. Паступова героі фільма разумеюць, што ёсць у жыцці рэчы, непадуладныя ніякім сучасным тэхналогіям...

Пакуль вы вырашаеце, ці варта перагледзець стужку наноў — напрыклад, канал ТБ3 пакажа «Вечнае ззянне...» у наступную пятніцу, 28 чэрвеня, — нагадаем некаторыя цікавыя факты пра фільм, якія маглі дзіўным чынам сцерціся з вашай памяці.

✓ Ідэю стужкі падарыў сябар рэжысёра, мастак П'ер Бісмут, які прапанаваў: «Уявіце, што вам прыносяць паштоўку, дзе напісана: хтосьці, каго вы ведаеце, толькі што сцёр вас са сваёй памяці».

✓ У галоўнай мужчынскай ролі рэжысёр стужкі бачыў Нікаласа Кейджа, а ніяк не запіснога коміка Керы. Аднак першага прапанова не зацікавіла, а другі, наадварот, быў рады разбурыць трохі стэрэатыпнае ўспрыманне гледачоў і паспрабаваць штосьці новае — зусім не імпульсіўны, статычны вобраз.

✓ Усе эксцэнтрычныя адценні прычоскі Кейт Уінслет у фільме — гэта парыкі, а не здзек з валасоў актрысы. Яна гатовая была фарбавацца насамрэч, але фільм здымаўся не ў храналагічным парадку, таму колеры трэба было б змяняць некалькі разоў на дзень. Кожны колер мае сваё значэнне: зялёны — першая сустрэча, чырвоны — фантастычныя сцэны, аранжавы — рамантычныя стасункі, а сіні — паўторнае знаёмства пасля «чысткі» памяці. Самой Кейт, дарэчы, больш за ўсё падабаўся чырвоны парык.

✓ Абсалютная большасць эфектаў у фільме створаная без мантажу: так, у сцэне, дзе герой бачыць сябе самога на прыёме ў доктара, рэжысёр прымусіў Джыма Керы насамрэч перапранацца і бегаць туды-сюды, а прыліў, які затапіў пляжны домік, — не намаляваны на камп'ютары, а сапраўдны.

✓ Першая версія сцэнарыя заканчваецца бясконцым цыклам сціранняў і ўз'яднанняў Клементіны і Джоэла: праз 50 гадоў пажылая Клементіна наведвае доктара і бачыць у камп'ютары спіс з 15 дат папярэдніх сціранняў памяці. Канчатковы фінал карціны, у якім героі вырашаюць пачаць адносіны з чыстага аркуша, больш аптымістычны.

Свежыя навіны ад «Звязды»!

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на III квартал або II паўгоддзе 2019 г., запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 16 ліпеня 2019 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Сярод падпісчыкаў 17 ліпеня 2019 года будуць разыграны сем умывальнікаў «Акватэкс» і суперпрыз — душавая кабіна «Акварэль». Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 25 ліпеня.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі па 30 верасня пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на III квартал або II паўгоддзе 2019 г. і пашпарта. Пасля 30 верасня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Свежыя навіны ад «Звязды»!» чытайце ў нумары 99 газеты «Звязда» ад 30.05.2019 г.

Тэлефон для даведак (017) 263 66 73.

Тэрмін правядзення гульні — з 01.06.2019 да 30.09.2019.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 3563 ад 28.05.2019 г. выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або II паўгоддзе 2019 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

_____

Падпіска аформлена і аплачана ў _____
(аддзяленне сувязі)

на III квартал або II паўгоддзе 2019 года

Хатні адрас і тэлефон _____ _____
(абавязкова) (індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

1 БЕЛАРУСЬ Беларусь 1

6.00, 7.25, 8.20 «Добрай раніцы, Беларусь!»
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
7.15, 8.10 Навіны эканомікі.
7.20, 8.15, 18.15, 0.20 «Зона Х» (16+).
9.15 «Галоўны эфір».
10.25, 13.00, 18.35, 19.25 Серыял «Аддай маю мару» (16+).
12.05 ІІ Еўрапейскія гульні.
13.25, 15.15 Меладрама «Партыя для чэмпіёнкі» (12+).
16.50 «Беларуская часінка».
17.45 «Служыць закону». Дак. фільм (12+).
21.00 «Панарама».
22.05 «Нашы» (6+).
22.25 Серыял «След» (16+).
0.00 «Арэна».

2 БЕЛАРУСЬ Беларусь 2

6.55, 20.05 «Тэлебарометр».
7.00 «Уключайся!» (12+)
8.55 ІІ Еўрапейскія гульні. Мінск-2019. Стральба кулявая. Мікст. Пісталет. 50 м. Кваліфікацыя. Стральба кулявая. Пнеўматычная вінтоўка. Мужчыны. Жанчыны. Кваліфікацыя. Дзюдо. Мужчыны. Жанчыны. Кваліфікацыя. Стральба кулявая. Мікст. Пісталет. 50 м. Фінал. **12.55** ІІ Еўрапейскія гульні. Мінск-2019. Баскетбол. 3х3. Мужчыны. Жанчыны. Папярэдні раўнд. Дзюдо. Мужчыны. Жанчыны. Кваліфікацыя.
16.55 ІІ Еўрапейскія гульні. Мінск-2019. Дзюдо. Мужчыны. Жанчыны. Фіналы.
19.20 «Суперлато».
20.35, 22.05 «Хаціна». Маст. фільм (16+).
22.00 «Спортлато 6 з 49», КЕНО.
23.00 «Ідзі сюды і танцуй».
23.05 «Капейка ў капейку» (12+).
23.40 «Арол і рэшка. Рай і пекла» (16+).

3 БЕЛАРУСЬ Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35, 12.25 «Беларуская кухня». Тушаная рыба з фасоляй і агародніна.
8.05, 12.00, 20.15 Навіны культуры.
8.25 «Нацыянальны хіт-парад».
9.15, 16.10 «Чужыя тут не ходзяць». Драма (12+).
10.30 «Навукаманія» (6+).
11.00 «Майстэрня. Гісторыя аднаго мастака». Уладзімір Тоўсцік.
11.20, 21.05 «Апошні дзень». Людміла Пахомава (12+).
12.20, 20.35 «Гэты дзень».
12.55 «Наперад у мінулае».
13.20 «Дзённікі беларускага падполля». Мінск (12+).
13.45, 18.55 «Ваенны ўрач. Мікалай Пірагоў. Тайны саветнік навукі». Дак. фільм (12+).
14.25, 21.40 «Апостал». Маст. фільм (16+) [СЦ].
15.20 «Артэфакты». Скарб, замураваны ў сцяну Брэсцкай крэпасці [СЦ].
15.45 «Запіскі на палях». Кузьма Чорны: злачынства і пакаранне беларускага Дастаеўскага [СЦ].
17.25 «Belcanto». Канцэрт Анастасіі Масквіной і Аксаны Волкавай.
19.35 «Тэатр у дэталях». Спектакль Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек «Хлопчык, які плаваў з пірання-мі».
20.00 «Архітэктура Беларусі».
20.40 «Калыханка» (0+).
22.35 «Майстры і куміры». Народная артыстка Беларусі Інэса Душкевіч.

5 БЕЛАРУСЬ Беларусь 5

8.05, 0.05 ІІ Еўрапейскія гульні. Мінск-2019. Вынікі дня.
8.35, 12.40, 17.25, 21.50, 23.45 Еўрацэнтр.
8.50 ІІ Еўрапейскія гульні. Мінск-2019. Стральба з лука. Мужчыны. Папярэдні раўнд / Настольны тэніс. Мужчыны. Жанчыны. Папярэдні раўнд.
12.55 ІІ Еўрапейскія гульні. Мінск-2019. Стральба кулявая. Пнеўматычная вінтоўка. Мужчыны. Жанчыны. Фінал / Стральба стэндавая. Мікст. Трап. Фінал / Стральба з лука. Мужчыны. Кваліфікацыя / Настольны тэніс. Мужчыны. Жанчыны. Папярэдні раўнд / Бокс. Мужчыны. Жанчыны. Кваліфікацыя.
17.40 ІІ Еўрапейскія гульні. Мінск-2019. Настольны тэніс. Мужчыны. Жанчыны. Папярэдні раўнд / Баскетбол. 3х3. Мужчыны. Жанчыны. Папярэдні раўнд / Бокс. Мужчыны. Кваліфікацыя.
18.55 ІІ Еўрапейскія гульні. Мінск-2019. Скачкі на батуце. Мужчыны. Жанчыны. Фінал / Аэробіка. Пары. Фінал / Лёгкая атлетыка. Медальная цырымонія / Баскетбол. 3х3. Мужчыны. Жанчыны. Фіналы / Настольны тэніс. Мужчыны. Жанчыны. Папярэдні раўнд / Бокс. Мужчыны. Жанчыны. Кваліфікацыя.
22.05 ІІ Еўрапейскія гульні. Мінск-2019. Стральба кулявая. Пнеўматычная вінтоўка. Мужчыны. Жанчыны. Фінал / Стральба стэндавая. Мікст. Трап. Фінал.
0.35 ІІ Еўрапейскія гульні. Мінск-2019. Стральба кулявая. Мікст. Пісталет. 50 м. Кваліфікацыя / Стральба кулявая. Пнеўматычная вінтоўка. Мужчыны. Жанчыны. Кваліфікацыя / Дзюдо. Мужчыны. Жанчыны. Кваліфікацыя / Стральба кулявая. Мікст. Пісталет. 50 м. Фінал / Баскетбол. 3х3. Мужчыны. Жанчыны / Дзюдо. Мужчыны. Жанчыны. Фіналы.

Н АНТ

6.00, 7.05, 8.05 «Наша раніца».
7.00 (з субцітрамі), **8.00** (з субцітрамі), **9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
9.10 Контуры.
10.00 «Жыць здорава!» (16+)
11.10 Серыял «Участак» (12+).
12.05 «Модны прыгавор» (12+).
13.10 Серыял «Умовы кантракта» (16+).
14.05 Меладрама «Кіроўца для Веры» (16+).
16.20 «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
17.25, 18.20 «На самай справе» (16+).
18.50 «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
18.55 «Няхай гавораць» (16+).
20.00 «Час».
21.10 «Анёл-захавальнік». Серыял (16+).
23.10 «Партызаны Беларусі». Фільм першы (16+).
23.40 «Гэтыя вочы насупраць». Серыял (16+).

С СТБ

5.30 «Вялікі горад».
Грашовая прэмія для Гомеля, як пераможцы па санітарным стане і добраўпарадкаванні ў першай катэгорыі, складзе восем тысяч базавых велічынь. Дарэчы, пераможцы — узорныя населеныя пункты Гомельскай вобласці — ёсць і ў іншых катэгорыях. Напрыклад, сярод гарадоў з насельніцтвам ад 10 да 50 тысяч жыхароў найлепшымі сталі ў тым ліку і Жыткавічы. Сярод чатырох пераможцаў у катэгорыі да 10 тысяч — два з Гомельшчыны: Брагін і Нароўля.

ЧАЛАВЕК І ЯГО СПРАВА

КЛОПАТ АБ ЛЮДЗЯХ

Найлепшая ў вобласці староста вёскі жыве ў палескай глыбінцы

Тры вуліцы, на якіх менш за сотню дамоў. Гэта Лагвошчы — вёсачка, якая знаходзіцца на поўдні Беларусі, у Жыткавіцкім раёне. Сёння насельніцтва тут — сотня чалавек з нечым. Вялікая частка — пенсіянеры. Кацярына ТРАФІМОВІЧ, староста населенага пункта, ведае кожнага жыхара і, напэўна, кожную жывёлу. Былую паштальёнку на агульным сходзе некалі, пры аб'яднанні сельсаветаў, людзі абралі лідарам. Вось яна і выконвае свой грамадскі абавязак — са шчырасцю і любоўю. Менавіта гэта, а яшчэ досвед працы прызналі найлепшым на Гомельшчыне па леташніх выніках.

Фота БелТА.

Да грамадскіх спраў, дарэчы, прыцягнута ўся сям'я. Нават конь Орлік, калі трэба, працуе не толькі на сваіх гаспадароў, але і на ўсю вёску. Муж Кацярыны Антонаўны Мікалай Фёдаравіч запрагае коніка, калі трэба каму з жыхароў падвезці дровы ці што зрабіць па гаспадарцы. Сорак тры гады сумеснага жыцця, а значыць, паразуменне з першага позірку і вырашэнне ўсіх праблем, у тым ліку грамадскіх, разам.

Сын цяпер у Мінску, дачка ў суседняй вёсцы, радуюць пяцёра ўнукаў і нават маленькая праўнучка. Але ж побач — тыя, у каго няма нікога, каму патрэбна дапамога ці проста добрае слова. Кацярына Антонаўна кажа, што такія цёплыя стасункі склаліся ў яе з людзьмі даўно. Яшчэ ў той час, калі працавала паштальёнкай:

— Я прарабіла на пошце 31 год. За гэты час, зразумела ж, з усімі добра пераznаёмілася. Мне кожны расказваў пра сваё гора, радасць і крыўду. І трэба было кожнага выслухаць, недзе суцешыць, недзе прамаўчаць.

Псіхолаг-аматар працавала ў якасці дэпутата сельсавета ў адным са скліканняў. І сёння паспявае спраўляцца і з асабістай гаспадаркай, і з клопатамі аднавяскоўцаў. Кажа, часта тэлефануюць самотныя людзі, каб выклікаць хуткую дапамогу, паправіць плот, просяць нешта растлумачыць, даць слушную параду. Усіх пытанняў, з якімі сутыкаецца староста, не пералічыць. Бываюць і такія, якія наскокам не вырашыць:

— Летась на мясцовых могілках шматгадовыя хвоі атакаваў караед. Людзі пачалі мне тэлефанаваць. На першым агульным сходзе не ўсе былі гатовыя плаціць грошы, каб выклікаць прафесійных альпіністаў, якія выдалілі б хворыя дрэвы. Але ж, калі дрэвы пачалі падаць, зноў сабралі сход. Тады і пераканалі ўсіх у неабходнасці экстранных мер. Мы нават выступалі праз мясцовую прэсу. Урэшце атрымалася сабраць больш за 2,1 тысячы рублёў. Выразалі той страшны лес і навялі парадак. Людзі — усе, хто можа, — выходзілі на суботнікі. Павыграбалі смецце і галлё — цяпер чысціня і парадак.

Такім чынам выдалілі 60 пашкоджаных, самых небяспечных дрэў. Але ж, дадае Кацярына Антонаўна, засталося яшчэ што рабіць. Таму плануе восенню завершыць добраўпарадкаванне на могілках.

Захоўваюць у Лагвошчах памяць пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Вёска цудам не паўтарыла лёс Хатыні. Мясцовых жыхароў карнікі ўжо загналі ў адрыну, аднак школьная настаўніца, якая ведала нямецкую мову, прадухіліла трагедыю. Цяпер імёны тых, хто загінулі ў баях за свабоду роднага краю, хто сталі ахвярамі фашызму, ушанавалі на гранітным помніку. Падтрыманне парадку вакол памятнага месца — клопат жыхароў. Згодна з мясцовай традыцыяй, тэрыторыю выкладаюць зялёнымі хваёвымі шышкамі.

— Нашы Лагвошчы ўздоўж рэчкі Случ, — знаёміць з населеным пунктам Кацярына Трафімовіч. — І возера Белае тут побач. Вельмі прыгожыя ў нас мясціны. Між тым і аўтадарога, і чыгунка блізка. Таму да нас шмат народу прыязджае адпачываць. Ягады, рыба — усё ў нас ёсць. Некалькі дамоў выкарыстоўваюцца толькі ў летні сезон. Дачнікі ў нас сумленныя: і смецце прыбіраюць, і тэрыторыю каля сядзібы абкошваюць, і кветкі высаджваюць. І мы ім дапамагаем пры неабходнасці. Нядаўна адна жанчына папрасіла павесіць ліхтар каля яе дома. Мы арганізавалі ёй асвятленне. Калі ў мяне ўзнікаюць нейкія праблемы, я заўсёды вырашаю іх разам з памочніцамі: Нінай Волчак, Валянцінай Цыганковай і Галінай Таболіч. Адказныя людзі. Увогуле ў нас у сельсавеце ўсе дружныя. Таму часта са складанымі пытаннямі звяртаюся да старшыні сельвыканкама Алены Шпакевіч. Алена Іванаўна ў нас — залаты чалавек. Відаць, таму ўсё разам і атрымліваецца добра.

НЕАБХОДНАЯ ДАПАМОГА

Сацыяльныя праекты Веткаўскага краю

Веткаўскі раён, які асабліва пацярпеў ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС, уваходзіць у Буда-Кашалёўскую выбарчую акругу № 38. А гэта зона адказнасці старшыні Пастаяннай камісіі па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы Палаты прадстаўнікоў Мікалая ВАСІЛЬКОВА.

Дэпутат адзначае, што за апошнія тры з паловай гады Веткаўшчына стала яму сапраўды роднай. Ён імкнецца зрабіць усё магчымае, каб людзям тут жылося камфортней. Пры непасрэдным удзеле Мікалая Васількова ў акрузе атрымалася паспяхова рэалізаваць шэраг праектаў.

— У першую чаргу гэта рамонт дзіцячага аддзялення і добраўпарадкаванне тэрыторыі Веткаўскай раённай бальніцы. Пасля працяглай адсутнасці ў аграгарадку Свяцілавічы адкрылі аптэку. У гэтым жа населеным пункце ў сярэдняй школе замянілі вокны, набылі сучасны музычны комплекс, адрамантавалі фасад

Фота Ірыны АСТАШКЕВІЧ.

Дэпутаты Палаты Прадстаўнікоў Алег ЛЕЎШУНОЎ і Мікалай ВАСІЛЬКОЎ у вёсцы Малыя Нямкі Веткаўскага раёна.

Цэнтра культуры і вольнага часу. Дапамаглі і з рамонтам Цэнтра карэкцыйна-развівальнага навучання і рэабілітацыі.

Мікалай Васількоў адзначыў, што Пастаяннай камісіі па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы Палаты прадстаўнікоў абмеркаваны і падрыхтаваны важныя для краіны законы. Напрыклад, не так даўно ўступіў у дзеянне адноўлены Лясны кодэкс. Дарэчы, на разглядзе цяпер законапраекты аб змяненні Закона «Аб прававым рэжыме тэрыторый, якія падвергліся радыеактыўнаму забруджванню ў выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС», «Аб радыяцыйнай бяспецы», «Аб дзяржаўнай экалагічнай экспертызе, стратэгічнай экалагічнай ацэнцы і ацэнцы ўздзеяння на навакольнае асяроддзе» і «Аб асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях».

Між тым у вёску Малыя Нямкі Веткаўскага раёна Мікалай Васількоў заехаў разам з калегам — намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях Алегам Леўшуновым. Апошні, дарэчы, нарадзіўся ў гэтым населеным пункце. Масавае адсяленне мясцовых жыхароў пасля катастрофы адбывалася на вачах. Алег Фёдаравіч працаваў у красавіку 1986-га ў саўгасе «Паўночны». Не так даўно ён падарыў землякам сучаснае музычнае абсталяванне, а ў дзень 33-й гадавіны аварыі перадаў Маланямкоўскаму сельскаму дому культуры сертыфікат на аўдыёсістэму.

Ад шчырага сэрца

Фота Ірыны АСТАШКЕВІЧ.

На 25 літраў папоўніліся запасы донарскай крыві дзякуючы дэпутатам Гомельскага абласнога і гарадскога Саветаў дэпутатаў. Разам з актывістамі Чырвонага Крыжа яны сталі ўдзельнікамі дабрачыннай акцыі «Выратуем жыццё разам!» і бязвыплатна здалі кроў.

Галоўны ўрач Гомельскай гарадской клінічнай бальніцы № 3, дэпутат гарадскога Савета дэпутатаў Іван ХУДЗЯКОЎ пераканаў, што донарства крыві не павінна быць сродкам заробку:

— Калі разумееш, што кроў неабходная і нованароджанаму дзіцяці, і сталаму чалавеку, што яна можа выратаваць камусьці жыццё, эмоцыі проста перапаўняюць. Асабліва калі ты робіш гэта не за грошы, а ад шчырага сэрца.

Данацыю правяла Гомельская станцыя пераліванне крыві ў памяшканні Савецкай раённай арганізацыі беларускага таварыства Чырвонага Крыжа. Перад гэтым усе донары здалі неабходныя аналізы, прайшлі агляд урача-трансфузіёлага, падмацаваліся салодкім харчаваннем. За трыццаць хвілін амаль паўсотні чалавек здалі 25 літраў крыві.

АКЦЫЯ

Матэрыялы падрыхтавала Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ПРАЕКТЫ І РАШЭННІ

Рэсацыялізацыя магчымая

Аднаўленне дзеяздольнасці — таксама. Пра тое, якім чынам адаптуюцца да жыцця людзі з псіхічнымі асаблівасцямі, разважалі дэпутаты Гомельскага абласавета

У Дзмітрыя Дружыніна цёмная скура, аксамітны тэнар і ментальны дыягназ. Ён пранікнёна спявае пра белы снег. Спевамі хлопец займаўся з дзяцінства — прыёмная маці ў Жлобіне некалі завяла яго да педагога па вакале. Кажа, родныя бацькі адмовіліся ад яго ў дзяцінстве. Цяпер малады чалавек жыве ў Хальчанскім псіханеўралагічным доме-інтэрнаце для састарэлых і інвалідаў, які знаходзіцца ў Жлобінскім раёне.

Яшчэ адзін нумар мастацкай самадзейнасці — танцавальны — для ўдзельнікаў выязнога пасяджэння пастаяннай камісіі па развіцці сацыяльнай сферы Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў дэманструе Алег Патапаў. Мужчына скарае ўсіх пластычнасцю і адчуваннем рытму. Між тым у яго парушаны маўленне і слых. А танцы ён развучвае, калі глядзіць тэлевізар ці відэаролікі — у інтэрнаце такая магчымасць ёсць. Камп'ютары заўсёды занятыя маладымі людзьмі, якія нават не звяртаюць увагі на наведвальнікаў.

Хальчанскі дом-інтэрнат разлічаны на 380 месцаў, 85 з іх — для саслабленых хворых. Сёння тут жыве 364 чалавекі. 27 з іх — ляжачыя, 65 перасоўваюцца ў межах жылога пакоя. Паводле сацыяльнага пашпарта, у інтэрнаце пражываюць 202 мужчыны і 162 жанчыны. Асноўныя дыягназы — дэменцыя, разумовая адсталасць той ці іншай ступені, шызафрэнія. Штат супрацоўнікаў дома-інтэрната налічвае 216 чалавек.

Заняць з карысцю людзей, магчымасці якіх сур'ёзна абмежаваны неўралагічнымі і псіхіятрычнымі дыягназамі, — адна з задач, якія імкнуцца выконваць у доме-інтэрнаце. Удзел у мастацкай самадзейнасці — толькі адзін з кірункаў. Дэпутаты падрабязна цікавяцца практыкай работы камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне аблвыканкама па стварэнні камфортных умоў пражывання грамадзян у дамах-інтэрнатах на прыкладзе Жлобінскага раёна.

Дырэктар Хальчанскага псіханеўралагічнага дома-інтэрната Алена СТАРЫНСКАЯ праводзіць экскурсію па ўстанове і паказвае, якім разнастайным чынам пастаяльцам знаходзяць занятак:

— У нас працоўныя майстэрні, неабходнае абсталяванне і транспарт. Ёсць свая дапаможная гаспадарка. Выдзелены зямельны ўчастак і дзесяць цяпліц. Тыя, хто здольны працаваць і выконваць нескладаную работу, дапамагаюць вырошчваць агародніну і даглядаць жывёл.

Сапраўды, жанчыны пад наглядам персаналу працуюць у цяпліцах з задавальненнем, а таматы і агуркі хутка трапяць на стол тых, хто жыве ў інтэрнаце. Карысць відавочная: працатэрапія паўсюдна лічыцца адным з самых важных сродкаў рэабілітацыі такіх хворых. А вынік — вырашчаная агародніна значна дапамагае скараціць дзяржаўныя выдаткі на харчаванне.

— Хапае прыкладна на палову ад таго, што патрабуецца для поўнага забеспячэння, — расказвае Алена Міхайлаўна. — Нашы людзі занятыя на некаторых работах у суседняй гаспадарцы — ААТ «Бабоўскі». Да таго ж працуюць спартыўныя секцыі, гурткі па вязанні, шыцці, вышыванні, выпальванні, разьбе па дрэве, маляванні...

Загадчыца аддзялення суправаджанага пражывання Надзея Дранец заводзіць усіх на кухню. Абсталяванне там дамашняе. Кухары-аматары — пастаяльцы дома-інтэрната шчыра частуюць стравамі з цеста і мяса, якія нядаўна асвоілі.

— Наша задача, — кажа Надзея Сяргееўна, — сацыяльна-бытавая адаптацыя. Самае важнае — даць магчымасць чалавеку, які жыве тут, рэалізаваць сябе. Людзей трэба падрыхтаваць да выхаду і існавання па-за сценамі нашай установы, да жыцця ў соцыуме. Таму мы робім усё, каб людзі былі па максімуме і разнастайна задзейнічаны на працягу ўсяго дня. Іх жыццё павінна быць падобнае на наша.

Цяпліцы Хальчанскага псіханеўралагічнага дома-інтэрната.

Цяпер у аддзяленні 14 чалавек. Яны вядуць практычна самастойны лад жыцця, самі размяркоўваюць сваю пенсію, займаюцца ўборкай пакояў, дапамагаюць даглядаць інвалідаў-калясачнікаў, у іх шмат розных захапленняў: мастацкая самадзейнасць, спорт, прыкладное мастацтва.

Супрацоўнікі прызнаюцца, што тыя, хто да іх трапляе ўпершыню, часам не навучаны нейкім элементарным навыкам догляду за сабой. Таму некаторых даводзіцца вучыць, як малых дзяцей. Зразумела ж, падыход персанальны, з улікам узросту, фізічнага і ментальнага стану.

— Тут важна разумець індывідуальныя характарыстыкі і дапамагчы рэалізаваць той патэнцыял, які ёсць у чалавека, — лічыць **старшыня камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гомельскага аблвыканкама Пётр ШУЦЬКО.** — Каб чалавек не застаўся адзінокі. Працэс рэсацыялізацыі такіх хворых вельмі складаны. У кожнай стацыянарнай установе — а іх у Гомельскай вобласці чатырнаццаць — ёсць аддзяленне суправаджанага пражывання. Там жывуць людзі, у якіх ёсць патэнцыял для рэсацыялізацыі. У гэтых аддзяленнях створаны умовы, каб навучыць іх карыстацца бытавымі прыборамі, навучыць гатаваць, даглядаць сябе, размяркоўваць фінансавыя сродкі — увогуле, каб падрыхтаваць чалавека да жыцця ў грамадстве. Летась чатыры чалавекі на Гомельшчыне аднавілі дзеяздольнасць і цяпер жывуць у грамадстве. Дарэчы, аднаўленне можа адбыцца толькі праз суд. Далей такога чалавека суправаджаюць у сацыяльным тэрытарыяльным цэнтры. Між тым, пазбавіць дзеяздольнасці прасцей, чым яе аднавіць. Таму супрацоўнікі інтэрнатаў шукаюць сваякоў, якія б дапамагалі такім людзям. Бо якія б добрыя ўмовы ў дзяржаўных установах для іх ні ствараліся, хатнія заўсёды будуць лепшыя.

Намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гомельскага аблвыканкама Аляксандр ЛЯШЭНКА адзначае, што, нягледзячы на прынятыя ў вобласці меры, пытанне пра прадстаўленне спецыяльных жылых памяшканняў у псіханеўралагічных дамах-інтэрнатах усім недзеяздольным грамадзянам, у якіх ёсць патрэба, застаецца актуальным, бо колькасць іх апошнім часам павялічваецца:

— Разам з тым колькасць грамадзян, якія патрабуюць накіравання ў дамы-інтэрнаты агульнага і дзіцячага тыпу, памяншаецца. На сённяшні дзень усе дамы-інтэрнаты маюць неабходную матэрыяльна-тэхнічную базу і ўкамплектаваны адпаведнымі спецыялістамі. Пры гэтым ёсць і пытанні, якія патрабуюць хуткага рашэння. Так, не ва ўсіх дамах-інтэрнатах вобласці ёсць псіхолагі, спецыялісты па сацыяльнай рабоце, інструктар-метадыст па адаптыўнай фізкультуры, фізічнай рэабілітацыі.

Член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і старшыня пастаяннай камісіі па развіцці сацыяльнай сферы Гомельскага абласавета, галоўны ўрач Гомельскай клінічнай бальніцы № 1 Алег ЯДРАНЦАЎ кажа, што дзяржава шмат робіць для таго, каб палепшыць жыццё людзей з інваліднасцю:

— Пастаянна ўдасканальваецца заканадаўчая база. Многа робіцца для стварэння безбар'ернага асяроддзя для інвалідаў. На фінансаванне выдаткаў па ўтрыманні стацыянарных устаноў, умацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы, развіццё сеткі і паляпшэнне функцыянавання інтэрнатных устаноў прыцягваюцца бюджэтныя, пазабюджэтныя сродкі і сродкі спонсараў. Але ж, зразумела, няма межаў для ўдасканалвання. Напрыклад, у Хальчанскім доме-інтэрнаце нізкая якасць пітной вады. Утрыманне жалеза ў вадзе перавышае дапушчальны ўзровень амаль у дзесяць разоў. Таму мы прапануем жлобінскаму райвыканкаму тэрмінова разгледзець гэтае пытанне.

У перспектыве ў доме-інтэрнаце патрабуюцца капітальны рамонт сістэмы ацяплення, аднаўленне работы ліфтаў, капітальны рамонт сістэмы пажарнай сігналізацыі, удасканаленне безбар'ернага асяроддзя, замена мэблі.

Між тым усе дэпутаты сыходзяцца ў адным: важна, каб такія ўстановы не заставаліся ізаляванымі ад грамадства. Яно павінна ведаць пра ментальна хворых людзей і іх асаблівасці і рабіць так, каб людзям з ментальнай інваліднасцю было максімальна ўтульна жыць.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
Фота аўтара.

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении первого аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона), по поручению ОАО «Слуцк-Модуль» (продавец), проводит открытый аукцион по продаже:

лот № 1: комплекс имущества в составе:

№	Наименование	Инв. №	Общ. пл, кв. м
	Недвижимое имущество		
1	Здание инженерно-бытового корпуса, инв. № 98318, расположенное по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101	640/С-84380	10 378,5
2	Тепловые сети, инв. № 98342, расположенные по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101	640/С-84368	-
3	Площадка асфальтобетонная (инв. № 98364), расположенная по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101	640/С-84443	1612,5
4	Погрузочно-разгрузочная площадка (инв. № 98365), расположенная по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101	640/С-84378	783,6
5	Трансформаторная подстанция, расположенная по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 10116	640/С-84444	37,7
6	Сети водопровода (инв. № 98340, инв. № 98339, инв. № 98341), расположенные по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101	640/С-84373	-
7	Канализационная насосная станция (инв. № 98330), расположенная по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 10124	640/С-84377	25,2
8	Эстакада-площадка для мойки автомобилей, расположенная по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101	640/С-84445	-
9	Топливно-заправочный пункт (инв. № 98327), расположенный по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101	640/С-84371	-
10	Очистные сооружения дождевых стоков (инв. № 98331), расположенные по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101	640/С-84365	-
11	Градирня металлическая ККТ-35 (инв. № 25301), расположенная по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101	640/С-84372	-
12	Градирня металлическая ККТ-35 (инв. № 25300), расположенная по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101	640/С-84367	-
13	Контрольно-пропускной пункт, расположенный по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 1014	640/С-84440	8,1
14	Склад газовых баллонов, расположенный по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 10110.	640/С-84442	107,8
15	Вспомогательный корпус-часть, инв. № 98358, расположенный по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 10112	640/С-84381	1353,6
16	Объекты благоустройства, расположенные по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101	640/С-84370	-
17	Главный корпус, инв. № 98319, расположенный по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 10123	640/С-84382	22 590,0
18	Здание вспомогательного корпуса, инв. № 98360, расположенное по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 10113	640/С-51701	335,7
19	Склад тяжелых металлов, расположенный по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 10122	640/С-39784	634,6
20	Здание склада, расположенное по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 1018	640/С-38241	535,9
21	Производственное здание-котельная,инв. № 98361, расположенное по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 10121	640/С-51700	194,3
22	Гараж со вспомогательным корпусом, расположенный по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 1013	640/С-47756	1362,3
23	Здание склада, расположенное по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 10118	640/С-38242	2467,1
24	Здание информационно-вычислительного центра, расположенное по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 1011	640/С-38243	2393,6
25	Автомонтажный корпус, расположенный по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 10119	640/С-39783	8785,1
26	Дренажная насосная станция (инв. № 98329), расположенная по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 1017	640/С-84375	330,6
27	Сети канализации (инв. № 98626), расположенные по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101	640/С-84379	-
	Оборудование		
28	Кран мостовой электрический 16-5К-16,5-12УЗ, заводской № 147, инв. № по бух. учету 97097		
29	Кран мостовой электрический, заводской № 863, инв. № по бух. учету 98366		

Указанные объекты расположены на земельном участке площадью **8,4478 га** с кадастровым номером 624650100001006603 (предоставлен на праве постоянного пользования) по адресу: Минская область, Слуцкий район, г. Слуцк, ул. 14 Партизан, д. 101.

Земельный участок имеет ограничения в использовании: зона санитарной охраны поверхностных и подземных источников водоснабжения хозяйственно-питьевого назначения на площади 8,4478 га.

Часть объектов недвижимости сдается в аренду.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 7 800 000,00 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены – **780 000,00 бел. руб.**).

Лот № 2: комплекс оборудования в составе:

1	Трансформатор ТМЗ-1000/10-84У1, заводской № 250542, инв. № по бух. учету 8873
2	Трансформатор ТМЗ-630/10-82У1, заводской № 341321, инв. № по бух. учету 8874
3	Трансформатор ТМЗ-630/10-82У1, заводской № 351297, инв. № по бух. учету 8516
4	Трансформаторная подстанция КТП-1 (2КТП-630-10-81УЗ), инв. № по бух. учету 8868
5	Трансформаторная подстанция КТП-1 (2КТП-630-10-81УЗ), инв. № по бух. учету 8869

Объекты расположены по адресу: Минская область, Слуцкий район, г. Слуцк, ул. 14 Партизан, д. 101.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 9 108,00 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены – **910 000,00 бел. руб.**).

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Шаг аукциона – 5 процентов.

Порядок проведения аукциона регламентирован Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

Лицо, желающее участвовать в торгах, обязано подать организатору торгов в указанный в извещении срок заявление на участие в торгах, документ о внесении суммы задатка на р/с, указанный в извещении, с отметкой банка, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: юр. лицом РБ — копии устава со штампом о проведении гос. регистрации, свидетельства о гос. регистрации и их подлинники для заверения копий, доверенность представителю юр. лица или документ, подтверждающий полномочия руководителя юр. лица; иностранным юр. лицом — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык, легализованная в установленном порядке доверенность представителю юр. лица или другие легализованные в установленном порядке документы с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; индивидуальным предпринимателем РБ — копия свидетельства о гос. регистрации и подлинник для заверения копии; иностранным индивидуальным предпринимателем — легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; представителем гражданина Республики Беларусь, индивидуального предпринимателя РБ — нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного физ. лица, индивидуального предпринимателя — легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов на участие в торгах физ. лицо, индивидуальный предприниматель, представитель физ. лица, индивидуального предпринимателя, юр. лица, иной организации предъявляют оригинал документа, удостоверяющего личность. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов соглашение.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника предмет торгов продается ему по начальной цене, увеличенной на 5 %.

В день проведения торгов победитель торгов (единственный участник, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) подписывает протокол о результатах торгов.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона.

Оплата объектов производится в течение 30 (тридцати) календарных дней после подписания договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Возможно предоставление рассрочки оплаты объектов Лота № 1.

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (единственный участник, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) (покупатель).

При недостижении согласия между продавцом и покупателем имущества по форме и содержанию договора купли-продажи имущества указанный договор подписывается по форме, утвержденной ликвидационной комиссией.

Аукцион состоится **22.07.2019** в **11.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **19.07.2019** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8 017) 207-71-34, (8 029) 102-21-17.**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении повторного аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29
Предмет аукциона	
Лот № 1: квартира № 2, общая площадь **52,8 кв. м**, инвентарный № **100/D-120649**, число комнат – 2, по адресу: **г. Брест, ул. Гоголя, 1Г-12.** Начальная цена без НДС – **96 055,00 бел. руб.**	
Лот № 2: квартира, общая площадь **67 кв. м**, инвентарный № **200/D-167723**, число комнат – 2, по адресу: **г. Витебск, ул. Петруся Бровки, 25-122.** Начальная цена без НДС – **108 712,00 бел. руб.**	
Лот № 3: квартира, общая площадь **65,9 кв. м**, инвентарный № **200/D-167725**, число комнат – 2, по адресу: **г. Витебск, ул. Петруся Бровки, 25-136.** Начальная цена без НДС – **106 928,00 бел. руб.**	
Лот № 4: квартира 29, общая площадь **59,1 кв. м**, инвентарный № **400/D-154024**, число комнат – 2, по адресу: **г. Гродно, ул. Тавлая, 44Б-29.** Начальная цена без НДС – **82 973,00 бел. руб.**	
Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа — ЗАО «Центр промышленной оценки»	
Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 30 календарных дней с момента проведения торгов	
Условия оплаты предмета аукциона: Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан произвести оплату в размере 100 % стоимости имущества не позднее 30 календарных дней с момента заключения договора купли-продажи	
Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by Передача имущества победителю аукциона (единственному участнику аукциона), заключившему договор купли-продажи, производится по акту приема-передачи в течение 5 рабочих дней с момента внесения оплаты в размере 100 % стоимости недвижимого имущества. Победителю аукциона (единственному участнику аукциона), заключившему договор купли-продажи, обратиться за государственной регистрацией перехода права собственности на недвижимое имущество после передачи ему имущества в установленном порядке. Расходы, связанные с организацией и проведением торгов, заключением договора купли-продажи, удостоверением сделки, в том числе оплатой государственной пошлины, государственной регистрацией договора и перехода права собственности на недвижимое имущество, несет победитель аукциона (единственный участник аукциона), заключивший договор купли-продажи	
Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия	
Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 15.05.2019 г.	
Дата и время проведения аукциона	**05.07.2019** в 15.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».**
Дата и время окончания приема документов	**02.07.2019** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».**
Контактные телефоны	**+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «Газпром трансгаз Беларусь», г. Минск, ул. Некрасова, 9
Вид аукциона	Аукцион по комбинированной схеме (сначала на понижение, затем на повышение цены недвижимого имущества)

Предмет аукциона

№ лота	Наименование, площадь	Инвентарный номер	Адрес
1	**Гараж на 4 автомашины,** 89,3 кв. м	102/С-9461	Брестская обл., Каменецкий р-н, г. Высокое, ул. Советская, д. 114

Сведения о земельном участке	Земельный участок, общ. пл. 0,0245 га предоставлен Продавцу на праве аренды до 31.12.2114 для обслуживания здания гаража на 4 автомашины
Начальная цена с НДС 20 % – 8 875,06 бел. руб.	Шаг понижения цены: 443,75 бел. руб.
Минимальная цена – 8 431,31 бел. руб.	Шаг повышения цены: 443,75 бел. руб.

Срок подписания договора купли-продажи: 30 рабочих дней после проведения Продавцом корпоративных процедур по согласованию заключения сделки (в случае заключения договора купли-продажи с единственным участником аукциона, выразившим согласие на приобретение Лота по начальной цене, увеличенной на 5 %). В ином случае (2 и более участников торгов) – **10** рабочих дней после проведения аукциона

Информация по внесению задатка

Задаток 10 % от начальной цены лота перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа — ЗАО «Центр промышленной оценки»

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Оплата государственной пошлины за государственную регистрацию договора купли-продажи производится Покупателем. Расходы по государственной регистрации перехода прав на объект недвижимости возлагаются на Покупателя. До внесения задатка участники аукциона в обязательном порядке знакомятся с проектом договора купли-продажи

Предмет аукциона может быть снят с аукциона организатором в любое время до объявления его проданным

Дата и время проведения аукциона	**24.07.2019** в 15.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Дата и время окончания приема документов	**22.07.2019** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Контактные телефоны	**+37517-280-36-37; +375 29-317-95-42. auction@cpo.by; www.cpo.by**

Дарогі, рамонт і добраўпарадкаванне

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Жыхар вёскі Лісаўшчына Анатоль Анатолевіч паскардзіўся на дрэнны стан дарогі. Падчас дажджоў, вясновага разводдзя машыны буксуюць, не могуць праехаць у населены пункт. Аднойчы зімой хворага чалавека давялося везці да хуткай дапамогі на санках. Мужчына неаднаразова звяртаўся ў мясцовае дарожна-будаўнічае ўпраўленне. Жыхарам прапаноўваюць адрамантаваць гэтыя 600 метраў дарогі за ўласны кошт. Але для іх гэта непад'ёмная сума. «Мы не патрабуем зрабіць нам асфальт. Проста просім, каб дарогу прывялі ў належны стан», — падкрэсліў мужчына. Наталля Якубіцкая ўзяла пытанне на кантроль, а старшыні Гаранскага сельскага Савета дэпутатаў даручыла ў кароткія тэрміны звярнуцца з адпаведным лістом у абслугоўваючую арганізацыю, якая павінна прывесці дарожнае пакрыццё ў парадак. «Гэта скарга цалкам абгрунтаваная, — дадала Наталля Віктараўна. — Людзі не патрабуюць немагчымага, яны хочуць, каб службовыя асобы належным чынам выконвалі свае абавязкі».

Людміла Сямёнаўна трыццаць гадоў пражыла ва Украіне. Чатыры гады таму вярнулася на радзіму, каб даглядаць хворага брата, што жыве ў вёсцы Цюрлі Маладзечанскага раёна. Хата роднага чалавека ў непрыглядным стане. Таму яны ўзвялі побач невялікую прыбудоўку. Ды аказалася, што паставілі яе не там, дзе было ўзгоднена з камітэтам па архітэктуры і будаўніцтве. Жанчына цікавілася, ці магчыма афіцыйна надаць гэтай пабудове статус жылога дома. Наталля Якубіцкая паведаміла заяўніцы, што такое немагчыма па заканадаўстве. Аднак старшыня Мінаблсавета папрасіла Людмілу Сямёнаўну прадставіць па дадзеным пытанні поўны пакет дакументаў. «Давайце больш дасканала вывучым сітуацыю, і тады, магчыма, знойдзем выхад», — дадала старшыня Мінаблсавета.

Уладзімір Уладзіміравіч з Мачулішчаў паскардзіўся на адсутнасць элементарнага добраўпарадкавання на вуліцах. Наталля Якубіцкая паабяцала асабіста выехаць на месца і разабрацца ў сітуацыі.

Усяго ж Наталля Якубіцкая выслухала 25 зваротаў, і не толькі ад жыхароў Міншчыны. Усе пытанні будуць сістэматызаваны і разгледжаны адпаведнымі службамі. Кожны з заяўнікаў атрымае афіцыйны адказ.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

ЛІЧБАВАЯ ТРАНСФАРМАЦЫЯ

ВОДГУК ЯК ПАДАРУНАК

Сучасныя тэхналогіі дапамагаюць наладзіць дыялог паміж грамадствам і органамі ўлады

Беларускія даследчыкі ў рамках дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў распрацавалі вэб-рэсурс «Ацэнка мясцовай улады», стварылі трэнажор для навучання дзяржаўных служачых у сферы супрацьдзеяння карупцыі, шэраг комплексаў для правядзення тэсціравання (у тым ліку па антыкарупцыйнай дзейнасці і барацьбе з карупцыяй, ацэнцы прававой культуры дзяржаўных служачых).

Напачатку ў эксперыментальным рэжыме новы рэсурс плануецца размясціць на афіцыйным сайце адміністрацыі аднаго з раёнаў. У далейшым яго можна будзе ўстанаўліваць і на афіцыйных старонках іншых мясцовых органаў улады.

Над стварэннем новага прадукту працавалі супрацоўнікі Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь і Інстытута інфармацыйных тэхналогій Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі. Яны пастараліся зрабіць рэсурс максімальна простым і даступным для карыстальнікаў. Людзі змогуць ацэньваць паслугі, якія аказваюцца на мясцовым узроўні, па пяцібальнай шкале. Калі нават у нейкай галіне балы будуць невялікія, не трэба ўспрымаць гэта выключна як адмоўную інфармацыю. Такія ацэнкі дапамогуць выявіць патрэбы насельніцтва, магчымасці для развіцця рэгіёна. «Варта разглядаць водгук як падарунак мясцовай уладзе, як актыўнасць насельніцтва, жаданне працаваць над праблемамі, агучваць іх. Такі падыход дазваляе развіваць грамадскую ініцыятыву, уцягваць насельніцтва ў кіраванне на мясцовым узроўні», — заўважае **намеснік дырэктара па навукова-метадычнай рабоце Інстытута інфармацыйных тэхналогій БДУІР Ірына СІДАРЧУК.** Вэб-рэсурс дазволіць адсочваць дынаміку: пры дапамозе графікаў і табліц можна ўбачыць, як меркаванні насельніцтва мяняліся на працягу месяца, квартала, года, некалькіх гадоў. Да таго ж рэсурс мае рубрыку «зваротная сувязь», праз якую людзі змогуць паведамляць пра канкрэтныя праблемы. Такі дадатковы інструмент, які дапамагае збіраць меркаванні пра эфектыўнасць дзейнасці мясцовых органаў улады, можа дазволіць эканоміць: не трэба будзе выдаткоўваць грошы на сацыялагічныя апытанні, выезды.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Извещение о проведении открытого аукциона на право заключения договора аренды земельных участков
Организатор аукциона – Любанский районный исполнительный комитет

№ лота	Сведения о виде и предмете аукциона	Адрес объекта и его назначение	Срок аренды	Начальная цена объекта (рублей)	Сумма задатка (рублей)	Затраты по организации и проведению аукциона (рублей)	Ограничения и (обременение) прав в использовании земель
1	2	3	4	5	6	7	8
1	Аукцион на право заключения договора аренды земельного участка	Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки), расположенный по адресу: Минская обл., г. Любань, ул. Цветочная, участок № 72, площадь – 0,1498 га, кадастровый № 623450100001002877	50 лет	1 594,43	159,44	76,50 + расходы по размещению извещения в СМИ	Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона электрических сетей напряжением свыше 1000 вольт, площадью 0,0620 га; охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт, площадью 0,0120 га
2	Аукцион на право заключения договора аренды земельного участка	Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки), расположенный по адресу: Минская обл. г. Любань, ул. Тальская, участок № 160, площадь – 0,1415 га, кадастровый № 623450100001003117	50 лет	1 506,08	150,61	Расходы по размещению извещения в СМИ	Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт, площадью 0,0066 га; охранная зона сетей и сооружений водоснабжения, площадью 0,0154 га

Задаток в размере 10 % от начальной цены земельного участка перечисляется на р/с райфо № BY58 AKBB 36006200013190000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, код банка AKBBBY2X, код платежа 04002, УНН 600537220 с пометкой «Участие в аукционе, задаток за право аренды на земельный участок».

Аукцион состоится 24.07.2019 г. в 10.00 по адресу: г. Любань, ул. Первомайская, 24-а, малый зал заседаний райисполкома, 3-й этаж.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона возмещает расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, потерей сельскохозяйственного производства, связанные с изъятием земельного участка и публикацией извещения в средствах массовой информации. Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) в течение 10 рабочих дней со дня получения протокола аукциона. В течение двух рабочих дней после совершения вышеуказанных действий заключить с Любанским районным исполнительным комитетом договор аренды земельного участка и в двухмесячный срок со дня подписания договора аренды земельного участка осуществить государственную регистрацию возникновения права аренды на него;

получить в установленном порядке: разрешение Любанского районного исполнительного комитета на проведение проектно-изыскательских работ, архитектурно-планировочное задание, технические условия для инженерно-технического обеспечения объекта строительства, разработку архитектурного (строительного) проекта на строительство объекта в срок, не превышающий четыре месяца;

в течение одного года, со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации права на предоставленный земельный участок, приступить к занятию данного участка в соответствии с указанной целью и условиями его предоставления;

завершить строительство объекта в сроки, определенные проектной документацией.

Наличие возможности подключения к линии электроснабжения, водоснабжения, водоотведения и газоснабжения.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков на основании постановления Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462, при наличии не менее двух участников.

Для участия в аукционе представляются: заверенная банком копия платежного документа, подтверждающая внесение задатка, копия паспорта или иного документа удостоверяющего личность, для ИП и юридических лиц – копия свидетельства о государственной регистрации, копия устава, копия доверенности. При подаче заявления заключается соглашение с райисполкомом о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 24.06.2019 года в рабочие дни с 8.00 до 16.00 (перерыв на обед с 13.00 — 14.00) по адресу: г. Любань, ул. Первомайская, 24-а, райисполком, управление землеустройства Любанского райисполкома, кабинет 3.9. **Окончание приема заявлений на участие в аукционе — 19.07.2019 года в 13.00.**

Информацию о расположении земельных участков можно получить в управлении землеустройства райисполкома, участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, которые выставляются на аукцион, путем выезда к месту нахождения этих участков, предварительно позвонив по контактному телефону (8-01794) 67-5-86 (секретарь комиссии).

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 287 18 31;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 20 чэрвеня 2019 года.